

# «ТРЭБА БАЦЬКАМ І АБІТУРЫЕНТАМ РАЗУМЕЦЬ, ШТО ЎСЁ БУДЗЕ СПРАВЯДЛІВА»

**Моладзь здае іспыты — дзяржава стварае ўмовы**

(Працяг на стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

31 МАЯ СУБОТА № 104 (30492)

# МЫ БАЧЫМ У ВАС НАШУ БУДУЧЫНЮ

**Дарагія сябры!**

У першы дзень лета мы па традыцыі адзначаем Міжнародны дзень абароны дзяцей.

У нашай краіне з вялікай адказнасцю ставяцца да кожнага дзіцяці. Мы бачым у вас нашу будучыню. Укладваем шмат працы, каб ваша дзяцінства было шчаслівым, напоўненым новымі ведамі і пазітыўнымі эмоцыямі.

Для гэтага створаны неабходныя ўмовы: якасная адукацыя, шырокая сацыяльная падтрымка, даступная медыцына — усё, што трэба для рэалізацыі амбіцыйных планаў.

Упэўнены, вы прадоўжыце нашы пачынанні — ад распрацоўкі новых тэхналогій і кіравання складанымі механізмамі да развіцця эканомікі, сацыяльнай сферы і абароны нашай дзяржавы. І, канешне, будзеце бясконца любіць родную Беларусь і ганарыцца ёю.

Дарагія дзеці! Няхай ваша жыццё будзе напоўнена радасцю, яркімі адкрыццямі і клопатам любячых дарослых. Няхай здзяйсняюцца самыя смелыя мары. Здзіўляйце нас сваімі талентамі, поспехамі ў вучобе, творчымі і спартыўнымі дасягненнямі.

Жадаю вам моцнага здароўя і, зразумела, насычаных і цікавых летніх канікул.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота з архіва БелТА.

СТАР. 8–9

ХЛЕБНЫХ СТРАЎ МАЙСТРЫ 10–11



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## ЖЫЛЛЁВЫЯ ПЫТАННІ, ВЫПУСКНЫЯ, ЗНІЖКІ

**Што змяняецца з 1 чэрвеня?**

Новыя ўмовы выдачы льготных крэдытаў на будаўніцтва жылля, апошні тэрмін, каб адкрыць базавы рахунак у банку для атрымання сацыяльных выплат, гарачая пара ў навучэнцаў, у якіх наперадзе ЦТ, экзамены і выпускныя — расказваем пра гэтыя і іншыя падзеі і змяненні з чэрвеня.

СТАР. 7




ISSN 1990 — 763X
25104>

# «ТРЭБА БАЦЬКАМ І АБІТУРЫЕНТАМ РАЗУМЕЦЬ,

## Моладзь здае іспыты —

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклад аб уступнай кампаніі 2025 года. Кіраўніка дзяржавы традыцыйна цікавяць усе аспекты гэтага найважнейшага этапу для маладога пакалення беларусаў, а сёлета гэта больш за 56 тысяч чалавек. Таму сярод дакладчыкаў — міністр адукацыі Андрэй Іванец, віцэ-прэм'ер, які курыруе сацыяльную сферу, — Наталля Пяткевіч, першы намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Пярцоў і старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Васіль Герасімаў.



Фота БелТА.

### «МЫ ТРЫМАЕМ У ПОЛІ ЗРОКУ АРГАНІЗАЦЫЮ ЭКЗАМЕНАЎ»

Тлумачачы сутнасць гэтай размовы, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што хоць нюансы ўступнай кампаніі важныя, усё ж гэта не галоўнае.

**«Самае галоўнае — наша размова павінна прадэманстраваць людзям, насельніцтву, што мы трымаем у полі зроку на самым высокім узроўні працэс арганізацыі ўступных экзаменаў у ВНУ і экзаменаў па заканчэнні сярэдняга і базавага ўзроўню адукацыі.**

Асабліва паступленне ў ВНУ. Мы выдатна ведаем, якое значэнне мае дадзеная падзея ў сям'і, у адказнай сям'і. Самі праз гэта практычна ўсе праходзілі. Таму вельмі важна забяспечыць такую сістэму, якая б пераконвала нашых людзей у справядлівасці правядзення гэтай кампаніі», — патлумачыў ён.

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, як сёлета прайшоў цэнтралізаваны экзамен, ці апраўдала гэта новаўвядзенне сябе. «Калі апраўдала, то ў чым? Толькі шчыра, — адзначыў беларускі лідар. — Калі дзесьці памыліліся, трэба гэту сітуацыю выпраўляць, ні ў якім разе нельга яе рэтушаваць, таму што вельмі сур'ёзная справа».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што сёлета ўступная кампанія не зведала значных змяненняў, праходзіць без новаўвядзенняў, па вызначаным алгарытме. Аднак, як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, існуе няхай невялікі, але недабор на бюджэтныя месцы.

**«Мы павінны прымаць меры, каб гэтыя месцы былі заняты. Мы ж рыхтуем, асабліва за кошт бюджэту, тых спецыялістаў, якія вельмі патрэбныя для народнай гаспадаркі, — адзначыў ён.**

— Мінадукацыі, урад, як у гэтым кірунку працуюць? Што зрабілі і што трэба зрабіць?»

Яшчэ адзін аспект, які вылучыў Прэзідэнт, — празрыстыя ўмовы правядзення іспытаў. «Цэнтралізаваныя экзамены, тэсціраванне — усё гэта добра. Але мы памятаем працэс здачы экзаменаў і станоўча ацэньваем, калі выкладчык і абітурыент сядзяць насупраць і выкладчык бачыць гэтага абітурыента. Ці ўсё зроблена для такой празрыстасці? Таму што гэта галоўны элемент справядлівасці», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка не пакінуў без увагі і льготы пры паступленні. Ён пацікавіўся, як працуе гэты алгарытм, якія ёсць аб'ектыўныя праблемы. «Таму што я вас ведаю. Вы, хто сядзіць за гэтым сталом, людзі не толькі адукаваныя, але выдатнікі. І вы ўсё можаце ацэньваць са сваёй пазіцыі: веды, веды, вось не ведаеш — ідзі прэч... і да таго падобнае.

**А ў выніку, вы памятаеце, калі мы заканчвалі ВНУ, слабакі (калі зыходзіць з гэтых крытэрыяў) аказваліся мацнейшымі за тых выдатнікаў, якія здавалі экзамены. Асабліва прыстасаваныя да жыцця, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — Разумееце, пра што я кажу. Таму хацелася б пачуць тут вашу ацэнку».**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў станоўчы досвед папулярызацыі прафесійна-тэхнічнай адукацыі. У такія ўстановы павялічыўся набор, маладыя людзі імкнуцца паступіць у каледжы, тэхнікумы і прафтэхвучылішчы, што, па словах кіраўніка дзяржавы, не можа не радаваць. «Якія яшчэ дадатковыя меры трэба прыняць для таго, каб людзі ішлі атрымліваць прафесійна-тэхнічную адукацыю? І можа, на маім узроўні неабходна прымаць нейкія меры?» — пацікавіўся ён. Згодна з прадстаўленай кіраўніку дзяржавы інфармацыяй, сёлета на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі плануецца прыняць 28 тысяч чалавек, што на 1,2 тысячы больш, чым у 2024 годзе.

Гаворачы ў цэлым аб ходзе ўступнай кампаніі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Я не сумняваюся, што будзе сумленна. Хоць несумленна і не было». «Не было», — пацвердзіў старшыня Камітэта дзяржкантролю.

### ВЕДЫ ПЛЮС УДАЧА, І НІЯКІХ ХІТРЫКАЎ

«Проста патрэбна бацькам і абітурыентам разумець, што ўсё будзе справядліва. Не трэба ісці ні на якія хітрыкі. Прыходзіць у аўдыторыю для здачы экзаменаў неабходна са сваімі ведамі. Але ведаў замала, трэба яшчэ і каб удача была. Вось веды плюс удача — і будзеш вучыцца ў ВНУ», — параіў кіраўнік дзяржавы абітурыентам і іх бацькам. Ён звярнуў увагу, што заўсёды ёсць месца выпадковасці, форс-мажорам, але ў цэлым працэс прадуманы так, каб пазбегнуць выпадковасцяў.

**«І калі нешта здарыцца, мы павінны ўбачыць гэта. І паглядзець на тых людзей, якія, можа быць, да нас звернуцца, каб мы яшчэ раз зірнулі на іх веды. Не заўсёды ж бывае, як мы плануем, напэўна, дзесьці кагосьці страцім. Але страчваць мы не павінны. Не трэба ў гэтай сітуацыі крыўдзіць сям'ю і маладога чалавека, які толькі становіцца на нармальны жыццёвы шлях», — звярнуўся ўжо да адказных асоб кіраўнік дзяржавы.**

### ВЕРАГОДНАСЦЬ ПАМЫЛКІ ЦАЛКАМ ВЫКЛЮЧАНА

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся не дакладамі, а асаблівасцямі ўступнай кампаніі. Міністр адукацыі Андрэй Іванец адзначыў, што ўступная кампанія праходзіць строга на прынцыпах роўнасці, справядлівасці і празрыстасці. У трэці раз выпускнікі 11-х класаў здаюць два цэнтралізаваныя экзамены: адзін прадмет па выбары і дзяржаўную мову. Раней яны пасля школы здавалі чатыры прадметы.

Аляксандр Лукашэнка ўдакладніў, як менавіта праходзяць цэнтралізаваныя экзамены. Андрэй Іванец растлумачыў, што гэта фактычна кантрольная работа, якая выконваецца ў тэставай форме. Усе работы правярае камп'ютар.

**«Хацеў бы адзначыць, што два незалежныя чалавекі пасля камп'ютара кожную работу пераправяраюць. Тут цалкам выключана верагоднасць памылкі», — удакладніў ён. Выпускнікі школ сёлета здавалі ЦЭ ў адзіныя даты — 26 і 29 мая — па прадмеце на выбар і па адной з дзяржаўных моў адпаведна. Было задзейнічана 144 пункты правядзення ЦЭ.**

«Здаюць выпускнікі сярэдняй школы. Гэта значыць, 11 класаў скончыў — і ты не ў школе, як раней... Ты не чатыры экзамены здаеш, а адзін на выбар і беларускую або рускую мову», — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. Міністр пацвердзіў, што так яно і ёсць. Выпускнікі школ здаюць два ЦЭ і атрымліваюць па выніках атэстат за 11 класаў адукацыі. Сертыфікаты з адзнакамі за цэнтралізаваныя экзамены і атэстат выкарыстоўваюцца для паступлення ва ўстановы вышэйшай адукацыі. Гэтак жа абітурыент павінен здаць цэнтралізаванае тэсціраванне па адным прадмеце, які выбіраюць у залежнасці ад профілю ВНУ, куды паступаюць.

«Калі ты гісторыю за 11 класаў здаваў, то ты паступаеш кудысьці на гістфак або гуманітарны факультэт, дзе ёсць гісторыя», — растлумачыў Прэзідэнт. Гэта пацвердзіў і міністр адукацыі: сертыфікат аб здачы ЦЭ або ЦТ выкарыстоўваецца для падачы дакументаў у ВНУ.

«Калі на «выдатна» здаў, то, вядома, будзеш яго выкарыстоўваць, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Калі не, то ты можаш яшчэ здаваць экзамен у ВНУ. Так?» Андрэй Іванец растлумачыў, што кожны выпускнік

# ШТО ЎСЁ БУДЗЕ СПРАВЯДЛІВА»

## дзяржава стварае ўмовы

можа здаць ЦТ толькі па адным прадмеце. «Раней была магчымасць здаваць чатыры цэнтралізаваныя тэсціраванні. Але мы адышлі ад гэтага, каб пазбавіцца бегатні. Калі мы здаём два цэнтралізаваныя экзамены і адно цэнтралізаванае тэсціраванне, нават калі абітурыент пойдзе ў розныя ВНУ, ён пойдзе па адным профілі: інжынер, гуманітарый, эканаміст альбо праваназнаўца», — патлумачыў Андрэй Іванец. Ён удакладніў, што для паступлення павінна быць тры сертыфікаты на руках, каб ужо на пачатковым этапе была відаць прафілізацыя.

Кіраўнік дзяржавы задаў яшчэ адно пытанне: колькі ўступных выпрабаванняў у выніку праходзіць выпускнік, які хоча вучыцца, напрыклад, на гістфаку ў ВНУ? Міністр адказаў, што на спецыяльнасці такога профілю трэба здаць ЦЭ па рускай або беларускай мове, абавязковы для ўсіх выпускнікоў, а таксама гісторыю і грамадазнаўства ў форме ЦЭ і ЦТ. «Для паступлення на гістарычны кірунак у яго павінна быць тры сертыфікаты на руках. Але не так, каб ён бегаў у ВНУ на розныя спецыялізацыі. А каб была прафілізацыя на ранніх падступах», — адзначыў першы намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Пярцоў.

У сваю чаргу намеснік Прэм'ер-міністра Наталля Пяткевіч, якая ўзначальвае Дзяржаўную камісію па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступнай кампаніі ў 2025 годзе, звярнула ўвагу, што ў выпускнікоў няма магчымасці здаваць тэсціраванне адразу па некалькіх прадметах, трэба выбраць толькі адзін — менавіта той, які спатрэбіцца для паступлення на пэўную спецыяльнасць. І калі, напрыклад, хтосьці дрэнна здаў гісторыю на ЦТ, у яго няма магчымасці здаць яшчэ тэсціраванне па іншым прадмеце. Тады можна толькі падаць дакументы ў іншую ВНУ, дзе ёсць таксама гістарычная спецыяльнасць, але меншыя прахадныя балы.

«Гэта задавальняе сем'і нашых абітурыентаў?» — пацікавіўся Прэзідэнт.

**«Абітурыенты і бацькі станоўча ўспрымаюць. Таму што гэта здымае дадатковы стрэс і двайную нагрузку, калі трэба было здаваць экзамен як у школе, так і пры паступленні ва ўніверсітэт», — расказаў міністр.**

### СІСТЭМА ПАКАЗАЛА СВАЮ ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

Андрэй Іванец таксама далажыў, што пры правядзенні двух цэнтралізаваных экзаменаў восем чалавек не змаглі скончыць выпрабаванні па медыцынскіх паказаннях. Верагодна, гэта выклікана стрэсам. Але маладым людзям была своечасова аказана медыцынская дапамога і яны змогуць скончыць экзамены ў рэзервовыя тэрміны ў канцы чэрвеня. «Сёлета зрабілі больш жорсткімі патрабаванні па праносе мабільных тэлефонаў: яны забаронены не толькі ў аўдыторыях, дзе непасрэдна праходзіць экзамен, але і ў цэлым на пункце правядзення экзамену. З ЦЭ быў выдалены толькі адзін чалавек за мабільны тэлефон. І адзін чалавек за тое, што ён працягваў запаўненне бланкаў пасля заканчэння часу, адведзенага на праходжанне іспыту. З 56,6 тысячы выпускнікоў гэта добры вынік», — адзначыў міністр.

**«Добры, — пагадзіўся Прэзідэнт. — Тое, што вы патрабаванні робіце больш жорсткімі, асабліва па тэлефонах і іншае, — нават казаць не трэба. Ты прыйшоў — і галоўнае, каб у руках галава была. Прыйшоў — сядай, працуй, таму тут не абмяркоўваецца».**

«Мы памятаем памылкі, якія былі два гады таму. Правялі работу над памылкамі летась, абкаталі сістэму, і сёлета яна паказала ў тым ліку сваю эфектыўнасць», — адзначыў Андрэй Іванец. Ён удакладніў, што мае на ўвазе. Усе сканіраваныя работы размяшчаюцца ў асабістым кабінеце выпускніка. Па словах міністра, фактычна ён можа ўбачыць сваю работу, самастойна яе праверыць. Сістэма разлікаў балаў размешчана на сайце Міністэрства адукацыі. Яна два гады не змянялася. Да абвяшчэння вынікаў можна самому палічыць балы і потым пераправерыць.

«Правядзенне цэнтралізаванага экзамену і цэнтралізаванага тэсціравання праходзіць у адзіныя тэрміны, што здымае пытанне аб магчымых няроўных ці іншых умовах для выпускнікоў гэтага года і мінулых гадоў, — адзначыў Андрэй Іванец. — У Дзяржаўную камісію паступіла больш за 50 зваротаў. Як правіла, яны звязаны з перарэгістрацыяй на тыя ці іншыя прадметы: калі малады чалавек ці бацькі вырашылі памяняць прадмет да здачы экзамену, яны звяртаюцца ў Дзяржаўную камісію. І, як правіла, яна ідзе насустрач і дазваляе». Яшчэ адзін момант — магчымасць праносу на іспыты медыкаментаў для забеспячэння здароўя дзяцей. Напрыклад, гаворка ідзе пра абітурыентаў з цукровым дыябетам. У такім выпадку неабходна медыцынскае заключэнне.

**Валерыя СЦЯЦКО.**




## У тэму

### Чалавечы фактар уплыву на адзнаку выключаны



«На сёння можна з упэўненасцю сказаць, што чалавечы фактар з пункту гледжання ўплыву на адзнаку выключаны», — паведаміла ў размове з журналістамі **намеснік Прэм'ер-міністра Наталля ПЯТКЕВІЧ, старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступнай кампаніі ў 2025 годзе**. «Калі прадумвалі гэту сістэму, пакрокава прайшліся па ўсіх момантах з тым, каб немагчыма было ніяк умяшацца. Каб не маглі западозрыць, што нехта можна дамовіцца, што могуць быць нейкія злоўжыванні, што можна кагосьці «заваліць» ці, наадварот, кагосьці «падняць», — удакладніла яна.

Наталля Пяткевіч падкрэсліла, што ўсе этапы правядзення цэнтралізаваных экзаменаў і цэнтралізаванага тэсціравання — ад фарміравання канвертаў з заданнямі да іх дастаўкі ў пункт здачы іспытаў і адкрыцця ў аўдыторыях — знаходзяцца пад пільным кантролем. «Я сама бачыла гэта, гэта бачылі члены Дзяржаўнай камісіі, — адзначыла Наталля Пяткевіч. — Кожнае месца правядзення цэнтралізаванага экзамену, цэнтралізаванага тэсціравання і кожная ўстанова адукацыі, дзе праходзіць уступныя працэс, ахоплены кантролем з боку Дзяржаўнай камісіі».

Віцэ-прэм'ер таксама расказала, што ў рамках Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступнай кампаніі ў краіне створана 321 камісія на месцах.

### Структура набору ў ВНУ адпавядае патрэбам эканомікі



Журналістам **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ** расказаў, што ў мінулым годзе былі пэўныя складанасці з наборам, у першую чаргу, на спецыяльнасці аграпрамысловага комплексу і па асобных інжынерных спецыяльнасцях. Прэзідэнту далажылі, якія меры прынятыя для вырашэння дадзенай праблемы. «Перш за ўсё гэта пытанне структуры набору і вызначэння адпаведных месцаў ва ўстановах вышэйшай адукацыі. 48,2 тысячы месцаў прадугледжана для нашых абітурыентаў у ВНУ. Фактычна кожны чацвёрты — гэта будучы інжынер. Кожны дзясяты — будучы педагог альбо медык. Структура падрыхтоўкі і набору ва ўстановы вышэйшай адукацыі ў поўнай меры адпавядае патрэбам у кадрах нашай эканомікі», — адзначыў Андрэй Іванец.

Міністр звярнуў увагу, што сёлета ўпершыню будуць паступаць выпускнікі інжынерных класаў — каля 2,4 тысячы абітурыентаў. Выдатнікі змогуць па сумоўі, без экзаменаў паступіць ва ўніверсітэты як на інжынерныя спецыяльнасці, так і на педагагічныя спецыяльнасці негуманітарнага профілю.

«Істотна вырас аб'ём набору на прафтэхадукацыю (гэта будучыя спецыялісты рабочых прафесій). Фактычна кожны другі дзевяцікласнік выбірае траекторыю паступлення ў каледж, а не ідзе ў 10-ы і 11-ы класы для навучання ў школе. Гэта вельмі важна для нас, — падкрэсліў Андрэй Іванец. — Мы працуем над траекторыяй атрымання імі вышэйшай адукацыі. Сёлета плануем прыняць у ВНУ 8,2 тысячы выпускнікоў каледжаў па скарочанай праграме».

Па словах міністра адукацыі, скарочана непрофільная падрыхтоўка ВНУ. «Летась мы спынілі такую падрыхтоўку па 20 спецыяльнасцях, сёлета яшчэ па 50. Гаворка ідзе пра тое, што кожны ўніверсітэт павінен набіраць для падрыхтоўкі тых студэнтаў, пад якіх у яго маецца і адпаведны прафесарска-выкладчыцкі склад, і матэрыяльна-тэхнічная база, каб падрыхтаваць сапраўды высакакласнага спецыяліста, а не гнацца за псеўдапрэстыжнасцю таго ці іншага кірунку», — удакладніў Андрэй Іванец. Ён таксама адзначыў, што заданні, па якіх праходзяць і экзамены, і тэсціраванне для выпускнікоў гэтага і мінулых гадоў, — абсалютна ідэнтычныя. «Таму гэта аб'ектыўная ацэнка, меншы стрэс. Мы бачым, што шмат у чым людзі станоўча ўспрымаюць гэту яшчэ маладую сістэму, якая ўжо добра сябе зарэкамендавала», — падсумаваў міністр адукацыі.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | Копыльское райпо, г. Копыль, пл. Ленина, 21 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронного аукциона**

**Лот № 1**

**Парикмахерская 84,4 кв. м** (здание специализированное для бытового обслуживания населения), инв. № 642/С-11164.
Адрес: **Минская обл., Копыльский р-н, г. Копыль, пл. Ленина, д. 21Б.**
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0311 га** предоставлен на праве аренды (срок действия: по 19.05.2035) для строительства и обслуживания парикмахерской. Ограничения (обременения) прав на зем. участок: природные территории, подлежащие спец. охране (водоохран. зона р. Мажа, зона санит. охраны водного объекта), охранные зоны электрической сети (0,0092 га)

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 69 000,00 бел. руб.**

**Лот № 2**

**Магазин 102,6 кв. м** (здание специализированное розничной торговли), инв. № 642/С-42334, составные части: сарай.
Адрес: **Минская обл., Копыльский р-н, Бобовнянский с/с, д. Калиновка 2, ул. Советская, 1А.**
***Сведения о земельном участке***: пл. **1,1249 га** предоставлен на праве аренды (срок действия: по 11.02.2035) для строительства и обслуживания магазина. Ограничения (обременения) прав на зем. участок: охранные зоны электрической сети (0,0040 га)

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 17 200,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30 (тридцати)** дней после подписания договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by).
Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель торгов либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 6 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 02.07.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие принимаются по 01.07.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «АстиконСнаб», г. Минск, ул. Лынькова, дом 17, корп. 3Н, комн. 1Д |

| **Предмет электронных торгов: оборудование (б/у), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, д. 53** | **Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.** |
|---|---|
| **Лот № 1.** Станок для производства полотенец МН-230/2, 2019 г. в., инв. номер 70 | **72 000,00** |
| **Лот № 2.** Линия по производству туалетной бумаги, инв. номер 59 | **75 600,00** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату внесения платежа на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **8 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов 01.07.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок**
Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **30.06.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

АКТУАЛЬНА

# ПРЫЯРЫТЭТЫ РАЗВІЦЦЯ

## Каля трэці інвестыцый арганізацый Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта ў 2024 годзе накіравана на развіццё сельскай гаспадаркі

Аб гэтым журналістам расказаў кіраўнік спраў Прэзідэнта Беларусі Юрый НАЗАРАЎ перад пачаткам пасяджэння калегіі ўпраўлення.



**«Інвестыцыі ў вытворчасць, у чалавечы капітал — наш абсалютны прыярытэт. Мы для сябе гэту задачу вызначылі як прыярытэтную. Таму што на любым прадпрыемстве і арганізацыі без інвестыцый няма развіцця, а калі няма развіцця, то няма і будучыні. Таму ўсе сферы для нас важныя. Цяпер мы рэалізоўваем каля 40 інвестпраектаў», — расказаў Юрый Назараў.**

На калегіі разглядаецца ход іх рэалізацыі. «Яны ў рознай ступені рэалізацыі. Па некаторых ужо ацэньваем эфект, які атрымалі», — дадаў кіраўнік.

Юрый Назараў адзначыў, што ў Кіраўніцтве справамі склалася даволі аптымальная структура інвестыцый.

**«Больш за 55 % інвестыцый укладваецца ў актыўную частку асноўных сродкаў — набыццё машын, абсталявання, транспартных сродкаў, інструменту, інвентару. Каля 30 % накіроўваецца на будаўніча-мантажныя работы. Гэта значыць, мы ўкладваем менавіта ў развіццё. Дынаміка добрая», — падкрэсліў ён.**

У 2024 годзе аб'ём інвестыцый у асноўны капітал арганізацый Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта склаў каля 400 мільёнаў рублёў. Калі браць па мінулым годзе, то каля 30 % ад агульнага аб'ёму інвестыцый пайшло ў сельскагаспадарчую вытворчасць. Таксама па 13 % прыпала на такія сферы дзейнасці, як санаторна-курортнае лячэнне, апрацоўчая прамысловасць, прыродаахоўная і турыстычная дзейнасць, нерухомая маёмасць. Каля 20 % інвестыцый накіраваны на праекты ў іншых сферах дзейнасці, што ажыццяўляюцца арганізацыямі, сярод іх — будаўнічы комплекс, гасцініцы, транспарт і складзіраванне, жыллёва-камунальная гаспадарка, гандаль, грамадскае харчаванне, прафесійная, навукова-тэхнічная дзейнасць.

**Паводле БелТА.**

АКЦЭНТЫ

# ВОБРАЗ БУДУЧЫНІ

## Канцэпцыю Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2026—2030 гады прадставілі ў Вярхоўным Судзе Беларусі

Выступаючы ўчора перад судзейскай супольнасцю, першы намеснік Прэм'ер-міністра Мікалай СНАПКОЎ адзначыў, што пяцігадовая праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны — дакумент з вызначэннем задач, якія адпавядаюць сучасным тэндэнцыям развіцця эканомікі, і інструментаў іх рэалізацыі, які ўлічвае вопыт папярэдняй пяцігодкі.



— База распрацоўкі новай пяцігодкі — даручэнні кіраўніка дзяржавы ў перадвыбарнай праграме, задачы пры прызначэнні ўрада; запыты грамадства па выніках маштабнага сацыялагічнага даследавання і прапановы навукі, — растлумачыў ён.

У прыватнасці, у канцэпцыі праграмы выбудавана новая архітэктура з канкрэтнымі адказнымі, механізмамі і крыніцамі фінансавання. Па выніках экспертнага дыялогу сфарміравана пяць кірункаў, якія вызначаюць аблічча будучыні.

Адзін з іх — развіццё чалавечага патэнцыялу, мэтай якога з'яўляецца праламленне дэмаграфічнай тэндэнцыі, настройка адукацыі пад запыт будучай эканомікі. Для гэтага прапануецца перагляд сістэмы падтрымкі сем'яў, плюс дадатковыя інструменты стымулявання нараджальнасці:

— Колькасць бясплатных спроб ЭКА павялічым да дзвюх. Новае развіццё атрымае сістэма сямейнага капіталу. Работу дзіцячых садкоў арганізуем пад патрэбы бацькоў — гнуткі графік, пашыраны набор дзяцей да двух гадоў.

Мікалай Снапкой адзначыў, што ў медыцыне будзе зроблены акцэнт на даступнасць, якасць і лічбавізацыю:

— У кожнай вобласці будзе функцыянаваць не менш за тры міжраённыя цэнтры медыцынскай дапамогі. Створым адзіную электронную базу пацыентаў.

Паводле яго слоў, ключавой задачай у сферы занятасці з'яўляецца задзейнічанне наяўных рэзерваў папаўнення патрэбы ў працоўных рэсурсах.

— Дадзім магчымасць жанчынам, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці, выходзіць на працу да яго заканчэння, — дадаў першы віцэ-прэм'ер. — Для гэтага не будзем абмяжоўваць выплату дапамогі, што забяспечыць ім матэрыяльную падтрымку.

Таксама будуць створаны ўмовы для працягу працоўнай дзейнасці пенсіянераў, якія змогуць адначасова атрымліваць заработную плату і поўны памер пенсіі.

— Будзем прыцягваць у краіну кваліфікаваную замежную працоўную сілу на ўмовах павышэння адказнасці наймальнікаў за работнікаў, якіх яны запрашаюць. Гэта дасць магчымасць забяспечыць якасны прыток замежных спецыялістаў і не створыць напружаную сітуацыю на прадпрыемствах і ў грамадстве, — упэўнены Мікалай Снапкоў.

Наступны кірунак — новыя стандарты якасці жыцця. У любым пункце дзяржавы павінны быць створаны камфортныя ўмовы пражывання.

— У цэлым па краіне плануецца пабудаваць больш за 650 інфраструктурных аб'ектаў з агульным аб'ёмам капітальных выдаткаў — звыш 20 мільярдаў рублёў, — растлумачыў першы намеснік Прэм'ер-міністра.

Палепшацца транспартныя зносіны паміж рэгіёнамі, больш будзе будавацца арэнднага жылля.

Трэці кірунак — сфера паслуг — таксама атрымае якаснае развіццё ў будучай пяцігодцы. Акцэнт — на турыстычным патэнцыяле як крыніцы росту эканомікі.

— Мэта — за пяцігодку павялічыць уклад сферы турызму ў ВУП у два разы (да 4,12 %), — патлумачыў спікер.

У ліку іншых прыярытэтаў — лічбавізацыя, тэхналагічная самадастатковасць, фарміраванне ўнутрыабласных агламерацый, экалогія і рацыянальнае прыродакарыстанне.

— Галоўная мэта пяцігоддзя — забяспечыць сацыяльную стабільнасць у грамадстве і збалансаваны эканамічны рост. Усе наяўныя ва ўрада рэсурсы, як таго і патрабуе кіраўнік дзяржавы, будуць сканцэнтраваны выключна на вырашэнні найбольш важных пытанняў, што хвалююць насельніцтва. Толькі прагматычны падыход і рацыянальнае выкарыстанне рэсурсаў, — запэўніў Мікалай Снапкоў.

У каментарыі журналістам Старшыня Вярхоўнага Суда Валянцін Сукала адзначыў, што Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2026—2030 гады плануецца разгледзець на Усебеларускім народным сходзе. Цяперашняя сустрэча з першым віцэ-прэм'ерам краіны дазволіць сфармуляваць тыя задачы, якія стаяць перад судовай сістэмай, і вызначыць той унёсак, які судовая сістэма можа зрабіць у паспяховую рэалізацыю гэтай праграмы.

НАПЯРЭДАДНІ

# У «БЕЛАГРА-2025» БУДУЦЬ УДЗЕЛЬНІЧАЦЬ БОЛЬШ ЗА 20 КРАІН

## Некаторыя з іх прыедуць да нас упершыню



**Як адзначыў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір ГРАКУН, сёлета Беларускі аграпрамысловы тыдзень, у рамках якога пройдзе 35-я Міжнародная спецыялізаваная выстава «Белагра-2025», будзе праходзіць з 3 да 7 чэрвеня.**

«Кожны год дадаюцца не толькі новыя кампаніі, але і краіны-ўдзельніцы, якія адчуваюць патэнцыял нашай дзяржавы і хочуць прадстаўляць сваю прадукцыю на выставе. Сёлета да «Белагра» плануюць далучыцца на ўзроўні афіцыйных дэлегацый і ўдзельнікаў больш за два дзясяткі краін. Некаторыя з іх прыедуць да нас упершыню: Батсвана, Гана, Зімбабвэ, Катар, Мазамбік, Рэспубліка Сербская, Боснія і Герцагавіна», — удакладніў намеснік міністра.

Ён дадаў, што на выставе таксама будуць прадстаўлены Кітай, Германія, Італія, Іран, Турцыя, В'етнам, Палесціна, Пакістан, Казахстан, Кыргызстан, Таджыкістан і Узбекістан. Ад Расіі будуць прадстаўнікі 18 рэгіёнаў, у тым ліку губернатар Прыморскага краю. 12 рэгіёнаў выстаўляць сваю прадукцыю — гаворка ідзе аб Бранскай, Варонежскай, Ліпецкай, Ніжагародскай, Новасібірскай, Растоўскай, Смаленскай і Чалябінскай абласцях, Краснадарскім і Пермскім краі, Санкт-Пецярбургу і Ямала-Ненецкай аўтаномнай акрузе.

«У параўнанні з 2024-м у нас дадаліся 55 кампаній — выстава з кожным годам прырастае», — заўважыў Уладзімір Гракун.

Прафесійным суправаджэннем стане дзелавая праграма: падчас дзясяткаў тэматычных канферэнцый і семінараў будзе абмяркоўвацца шырокае кола пытанняў па забеспячэнні канкурэнтаздольнасці сельскагаспадарчай прадукцыі і аб перспектывах узаемадзеяння Беларусі з краінамі блізкага і далёкага замежжа

Тэматыка раздзелаў ахоплівае практычна ўсе галіны АПК. Сёлета экспазіцыйная плошча форуму перавысіць 38,8 тысячы квадратных метраў. Найбуйнейшыя холдынгі сістэмы Мінпрама (а гэта «Гомсельмаш», «МТЗ-холдынг», «Бабруйскаграмаш», «БелаўтаМАЗ», «Амкадор» і іншыя) возьмуць самы актыўны ўдзел і прадэманструюць каля 135 узораў тэхнікі і абсталявання высокага тэхналагічнага ўзроўню — навінкі і найлепшыя серыйныя ўзоры прадукцыі.

«Будзе прадстаўлена звыш 20 адзінак новых відаў тэхнікі і абсталявання. Гэта красамоўна сведчыць аб устойлівай дынаміцы развіцця прамысловасці, гатоўнасці ў поўным аб'ёме забяспечыць унутраныя патрэбы краіны ў якаснай сельскагаспадарчай тэхніцы і абсталяванні», — адзначыў **начальнік упраўлення сельскагаспадарчага машынабудавання Міністэрства прамысловасці Андрэй СІНІЛА.**

Перавага і ўнікальнасць удзелу прадпрыемстваў сістэмы Мінпрама ў форуме заключаецца ў тым, што яны дэманструюць увесь спектр абсталявання і тэхналогій для АПК: тэхніку, навяснoе абсталяванне, рухавікі, камплектуючыя і многае іншае.

«У Беларусі забяспечваецца рытмічная вытворчасць запатрабаваных у аграрыяў відаў тэхнікі, пашыраецца мадэльны рад і паглыбляецца лакалізацыя прадукцыі. Вырабы прадпрыемстваў Мінпрама неаднаразова даказвалі сваю надзейнасць, высокую прадукцыйнасць і зручнасць у выкарыстанні», — адзначыў начальнік профільнага ўпраўлення.

Традыцыйна ў беларускім аграпрамысловым тыдні будуць удзельнічаць прадстаўнікі Мінсельгасхарча, Міністэрства прамысловасці, НАН Беларусі, Белдзяржхарчпрама, Белкаапсаюза. Зноў на пляцоўцы будзе выстаўляцца Беллегпрам.

Для жыхароў і гасцей сталіцы плануюць арганізаваць «Партызанскую паляну», дзе падчас выставы будзе раздавацца салдацкая каша.

Намеснік міністра акцэнтаваў увагу на тым, што аграрная выстава ўпершыню праходзіць на новай пляцоўцы BELEXPO, якая па плошчы на 6660 квадратных метраў перавышае папярэдняе месца правядзення ў «Вялікім камені». Да выставачнага цэнтра будзе хадзіць два прамыя аўтобусы № 912 і № 962, якія адпраўляюцца з цэнтра горада (станцыя метро «Акадэмія навук»). Беларускі аграпрамысловы тыдзень пройдзе з 3 да 7 чэрвеня.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ

# «НАДЫХОДЗІЦЬ НОВЫ ЭТАП»

## III З'езд партыі «Белая Русь» адбудзецца 28 чэрвеня



**Такое рашэнне было прынята ўчора на пасяджэнні Прэзідыума Вышэйшага палітычнага савета Беларускай партыі «Белая Русь». Папярэдне плануецца, што з'езд пройдзе на базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў Мінску.**

**Намеснік старшыні Беларускай партыі «Белая Русь» Андрэй БАСАК** адзначыў: «У сакавіку 2023 года адбыўся ўстаноўчы з'езд і была створана Беларуская партыя «Белая Русь». За гэты кароткі тэрмін партыя прайшла пэўныя этапы свайго будаўніцтва, у яе з'явілася сваё аблічча. Арганізацыйныя структуры партыі створаны ва ўсіх абласных, раённых цэнтрах нашай краіны. За гэты невялікі прамежак часу партыя вырасла больш чым у чатыры разы. На сёння звыш 67 тысяч чалавек з'яўляюцца членамі Беларускай партыі «Белая Русь». Яна рэалізуе шраг праектаў. З'явілася пазнавальнасць і на міжнароднай арэне».

Паводле слоў Андрэя Басака, правядзенне з'езда дазволіць вызначыць шляхі далейшага развіцця партыі. Да гэтага пройдзць справаздачна-выбарныя канферэнцыі ў раёнах і абласных цэнтрах нашай краіны. «Мяркуем, што ў з'ездзе будуць удзельнічаць каля 300 чалавек: 280 членаў партыі і каля 20 запрошаных гасцей», — дадаў ён.

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, член Вышэйшага палітычнага савета Беларускай партыі «Белая Русь» Вадзім ГІГІН** адзначыў «Нядаўна мы праводзілі ўстаноўчы з'езд. Сапраўды, партыя ўстала на ногі. Першапачатковы этап завершаны, і мы можам гаварыць пра пэўныя поспехі. Гэта і выбарчая кампанія па фарміраванні парламента, мясцовых органаў улады, дзе партыя «Белая Русь» заявіла пра сябе пераканаўча, мае сур'ёзнае прадстаўніцтва ў гэтых органах улады. Кампанія па выбарах кіраўніка краіны, дзе Беларуская партыя «Белая Русь» таксама выступіла заўважна, падтрымліваючы нашага Прэзідэнта» .

Спікер звярнуў увагу і на тое, што надыходзіць новы этап, калі члены партыі, грамадства ставяць новыя задачы. «І адна з іх — вызначэнне далейшых падыходаў, — дапоўніў Вадзім Гігін. — Вядома ж, адным з дасягненняў з'яўляецца міжнародны парадак дня. Партыя наладзіла сувязі са шматлікімі замежнымі партнёрамі. І той вопыт, які за час першапачатковага станаўлення назапашаны, неабходна абагульніць і паставіць сур'ёзныя задачы. Мы знаходзімся ў пачатку пяцігодкі якасці. Якасць, безумоўна, і ў грамадска-палітычным жыцці павінна прысутнічаць і быць на вышыні».

Як адзначыла **кіраўнік Сакратарыята Магілёўскага абласнога аддзялення Беларускай партыі «Белая Русь» Валянціна ШЭРГІЛАШВІЛІ,** Беларуская партыя «Белая Русь» адбылася як палітычная структура, палітычная сіла і сёння маштабна прырастае ў колькасці. «Члены партыі гатовыя і далей развіваць партыйнае будаўніцтва нашай краіны, — падкрэсліла яна. — Дзейнасць аддзяленняў партыі арганічна ўпісваецца ў рэгіянальны парадак дня. Магілёўскае абласное аддзяленне «Белай Русі» развіваецца актыўна: са 140 чалавек на першапачатковым этапе мы прыраслі да 13 тысяч. Гэта гаворыць пра многае. Партыя арганічна ўпісваецца ў палітычную сістэму беларускай дзяржавы. Мы бачым далейшае развіццё «Белай Русі» ў развіцці рэгіёнаў, развіцці партыйнага будаўніцтва ў рэгіёне. Усё гэта дае магчымасць і далей развіваць палітычную сістэму краіны».

**Яна ВАЛАСАЧ.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | КУП «МИНОБЛАВТОСЕРВИС», 220037, г. Минск, ул. П.Бровки, д. 27. тел. +375 17 356 00 62 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

| № лота | Предмет электронных торгов | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Легковой джип «**НИССАН X-TRAIL**», рег. знак 1017 АН-5, 2006 г. в. | 18 865,04 |
| 2 | Легковой минивэн «**ФОЛЬКСВАГЕН ТУРАН**», рег. знак 1028 АН-5, 2005 г. в. | 13 668,00 |
| 3 | Легковой внедорожник универсал (SUN UNIVERSAL) **GEELY EMGRAND X7**, рег. знак 1046 АН-5, 2014 г. в. | 9 588,00 |

**Местоположение: г. Минск, ул. П. Бровки, д. 27**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 19.06.2025**. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by по **18.06.2025 до 17.00**

**Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайтах Минского областного исполнительного комитета (https://minsk-region.gov.by/) и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (http://gki.gov.by)**

**Контактные телефоны**: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 317-95-42. **E-mail:** auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона) по поручению **филиала «Воложинское» открытого акционерного общества «Агрокомбинат «Дзержинский»** (продавец) проводит открытый аукцион

по продаже **здания склада грубых кормов с инв. № 632/С-33103 общей площадью 274,8 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622085715601000159 площадью 0,0355 га *(право постоянного пользования)* по адресу: Минская область, Воложинский район, Раковский с/с, аг. Раков, ул. Советская, 77А.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 45 348,82** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 4 534,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **02.07.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **01.07.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-64, 516-80-65, (8029) (8029) 136-31-11, 102-21-17.**
**Тел. для осмотра (8029) 113 18 61.**

УНП 601086805

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ НА 30 %

**Организатор аукциона: ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1**
**Продавец: КПУП «Хойникский ремонтный завод», г. Хойники, ул. К. Маркса, 39 – в лице ликвидатора Насонова В.В.**

**Торги состоятся 12 июня 2025 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28.**

Подробный перечень имущества: лоты №№ 1–11, 13–19, 21–25, 27, порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на сайте Гомельского областного исполнительного комитета – gomel-region.by в разделе «Экономика /Продажа-аренда», далее – «Извещения о проведении аукционов по продаже иного имущества», на сайте Организатора торгов – **www.ocenkaservis.by в разделе Аукционы-«Очные торги».**

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Хойніцкія навіны» от 22.03.2025 г., от 05.04.2025 г. в газете «Звязда» от 22.03.2025 г.

Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – **с 02.06.2025 по 10.06.2025 с 9.00 до 16.00**.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.: **8 (033) 634-86-95,** Насонов Николай Владимирович – (запись на осмотр имущества); **8 (029) 835-67-42,** Насонов Владимир Валерьевич.

Контактные данные организатора аукциона:
**(тел./факс) 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19**.
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

УНП 491382947

**ООО «Реалконсалтинг»**
**извещает о проведении открытого аукциона № 17/25 по продаже административного помещения в Минске**

Предмет аукциона
Лот № 1 – **Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-707952074, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, д. 144, пом. 18, площадь – 115,5 кв. м, назначение – Административное помещение, наименование – Административное помещение.**
Обременение: ипотека. Начальная цена – 186 000 долларов США

Аукцион проводится **02.07.2025 с 10.00 до 16.00**
в форме электронного аукциона на электронной торговой площадке «РЕАЛТОРГИ» по адресу: https://realtorgi.by/ (далее – ЭТП).
**Заявки на участие в аукционе принимаются по 30.06.2025 включительно до 17.00**

Для участия в аукционе необходимо:
1. внести задаток в размере **300 белорусских рублей** на расчетный счет продавца BY66OLMP30120001074740000933 в ОАО «Белгазпромбанк» БИК OLMPBY2X, получатель платежа – ООО «Стабильные технологии» УНП 191404584, назначение платежа: «Задаток для участия в аукционе № 17/25»;
2. пройти регистрацию на ЭТП и подать заявку на участие в аукционе с приложением документов, предусмотренных Регламентом ЭТП

Аукцион проводится в соответствии с Регламентом ЭТП (размещен по адресу: https://realtorgi.by/reglament-etp). Подавая заявку на участие в аукционе, участник аукциона принимает условия размещенного на странице лота (вкладка «Договор и документы») соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения электронного аукциона, устанавливающего права, обязанности и ответственность участника аукциона.
Победителем аукциона объявляется участник, предложивший наибольшую цену. Шаг аукциона: 5 процентов от начальной цены. В случае если заявка на участие по лоту подана только одним участником (далее – единственный участник), лот продается этому участнику с его согласия по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Победитель аукциона (единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона) возмещает организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения.
Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке.
Продажа предмета аукциона осуществляется по цене, сложившейся по результатам аукциона, в белорусских рублях, исходя из официального курса белорусского рубля по отношению к доллару США, установленного Национальным банком Республики Беларусь на дату оплаты предмета аукциона.
Победителю аукциона (единственному участнику, согласившемуся приобрести предмет аукциона по цене, увеличенной на 5 процентов) внесенный задат ок учитывается в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи предмета аукциона, другим участникам – возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Собственник имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до даты проведения аукциона, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона

**Организатор аукциона и оператор ЭТП:**
**ООО «Реалконсалтинг»,**
**УНП 191302068, г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8.**
**тел.: +375 (17) 256 61 35, +375 (25) 549 86 22,**
**auction@expertiza.by, https://www.expertiza.by**
**Продавец – ООО «Стабильные технологии»,**
**УНП 191404584, г. Минск, ул. Кнорина, д. 55/2-1, каб. 6**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(Организатор аукциона)*
по поручению **УП «Борисовский комбинат хлебопродуктов» ОАО «Минскоблхлебопродукт»** *(Продавец)*
проводит открытый аукцион
по продаже **здания овощехранилища**
**с инв. № 333/С-65487 общ. пл. 1 360,8 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 322350100001000638 пл. 0,1721 га по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Северная, 29.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 331 801,20** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 33 180,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **01.07.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.06.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра 8 (044) 538-61-27.**

УНП 600033917

| Условия, предусмотренные в решении о проведении аукционов: претендент на заключение договора на реализацию права проектирования и строительства обязан: в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона согласовать разработанный проект отвода земельного участка для проведения аукциона с установлением его границы и внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения); возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участника документации, необходимой для его проведения; не позднее 2 рабочих дней после внесения платы за предмет аукциона (части платы – в случае предоставления рассрочки её внесения), возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, заключить договор на реализацию права проектирования и строительства многоквартирного жилого дома с Могилевским городским исполнительным комитетом; соблюдать условия и требования, указанные в градостроительном паспорте земельного участка | | | | |

**Аукцион состоится 2 июля 2025 года в 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.**
Заявки принимаются ежедневно с 2 июня 2025 г. в рабочие дни с 8.00 до 13.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 203, 211.
**Последний день приема заявлений и внесения задатка – 27 июня 2025 года до 13.00.**
Заявления, поступившие после указанного срока, не принимаются.
Заключительная регистрация участников аукциона **2 июля 2025 года** с 14.40 до 15.00.
Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке организации и проведения аукционов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 13.01.2023 г. № 32

**Продавец предмета аукциона** – Могилевский городской исполнительный комитет, 212030, г. Могилев, ул. Первомайская,28а, контактные телефоны: (80222) 42-26-18, 42-26-83.

**Организатор аукциона** – МГУКПП «Проектное специализированное бюро», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, контактные телефоны: 8-0222-42-25-64, 42-24-59, 8-029-151-54-44.

**Задаток** вносится на текущий (расчетный) банковский счет Могилевского городского исполнительного комитета BY16AKBB36410174405547000000 филиал № 700 МОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, УНП 700123787 (разовый платеж), с отметкой банка **(назначение платежа – задаток за участие в аукционе по лоту №__).**

Участниками аукциона могут быть индивидуальные предприниматели или юридические лица. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

Для участия в аукционе индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием места нахождения земельного участка, право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на котором предполагается предоставить по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с организатором аукциона соглашение.

Задаток вносится в белорусских рублях в сумме и срок согласно настоящему извещению.

Кроме того, представляются:

- юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

- иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

- представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

- консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе.

Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

Перед началом аукциона его участники обязаны зарегистрироваться у организатора аукциона и обменять билеты участников аукциона на аукционные номера, которые возвращаются организатору аукциона после его окончания.

Аукцион проводится при наличии двух или более участников аукциона. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе аукциона наиболее высшую цену.

Если аукцион признан несостоявшимся из-за того, что заявление на участие в нем подано только одним индивидуальным предпринимателем или юридическим лицом либо для участия в нем явились только один индивидуальный предприниматель или юридическое лицо, соответствующее из указанных лиц согласовывает разработанный проект отвода земельного участка для проведения аукциона с установлением его границы при наличии его согласия с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Затраты на организацию и проведение аукциона письменно доводятся до сведения участников до начала проведения аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участником аукциона документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся соответственно победитель аукциона либо единственный подавший заявление на участие в аукционе индивидуальный предприниматель или юридическое лицо, выразившие согласие на приобретение предмета аукциона, обязаны:

- согласовать разработанный проект отвода земельного участка с установлением его границы;

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения Могилевским городским исполнительным комитетом);

- возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

После совершения лицом указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней Могилевский городской исполнительный комитет заключает с ним договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

Оплата стоимости предмета аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

Основные требования по проектированию и строительству указаны в земельно-кадастровой документации, подготовленной для проведения аукциона.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями.

Снос объектов и возмещение убытков производится в соответствии с законодательством лицами, которым предоставляются изымаемые земельные участки.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактные телефоны организатора аукциона для уточнения и получения дополнительной информации: г. Могилев (80222) 42-25-64, 42-24-59, +37529-151-54-44.**

У велізарных дзежах узважаныя да грама інгрэдыенты злучаюцца ў патрэбнай паслядоўнасці і ствараюць цеста, якое павінна «падняцца».

— Найважнейшыя працэсы на вытворчасці любога хлебабулачнага вырабу — гэта замес рошчыны і замес цеста, — расказвае **начальнік вытворчасці Вольга СІБІРКАВА.** — Потым цеста павінна выбрадзіць. Далейшыя этапы — раздзелка, расстойка (у працэсе якой цеста павялічваецца ў некалькі разоў у памеры), выпечка, астуджэнне, нарэзка і ўпакоўка. У суткі мы выпякаем каля 20 тон прадукцыі, у цэхах устаноўлена высокатэхналагічнае абсталяванне, але сама тэхналогія блізкая да таго, як пяклі хлеб спрадвеку.

Сёння асноўныя працэсы аўтаматызаваныя, адзначае суразмоўніца, але нават у сучасным высокатэхналагічным свеце хлебу патрэбны чалавечыя рукі.

— Хлеб «адчувае» настрой чалавека, і калі пекар «не ў гуморы», выпечка можа і не атрымацца, — тлумачыць Вера Багайчук. — Таму трэба працаваць з душой.

## ГАЛОЎНЫ КАНТРАЛЁР — СПАЖЫВЕЦ

Зразумела, што хлеб — прадукт асаблівы, і без «дробкі магіі» тут не абысціся. Але гэта не адмяняе дакладнае выкананне тэхналогіі і няспынны кантроль якасці.

— Уся сыравіна, якая паступае на вытворчасць, праходзіць уваходны кантроль, — **адзначае начальнік вытворчай лабараторыі Святлана ВАРАНКОВА.** — Якасць тэхналагічных аперацый адсочваецца на ўсіх этапах вытворчасці: мы — дзяржаўная кампанія, інакш быць проста не можа. Абавязковы арганалептычны і фізіка-хімічны кантроль гатовай прадукцыі, а наш фінальны «кантралёр» — пакупнік.

**Сёння канкурэнцыя на рынку хлебабулачных вырабаў велізарная, гавораць пекары. Але тут ёсць і свае плюсы: менавіта такі стан рэчаў трымае вытворцаў «у тонусе».**

— Мы адкрытыя для зваротнай сувязі. І, дзякуй богу, атрымліваем шмат станоўчых водгукаў спажыўцоў, калі людзі кажуць «дзякуй», — канстатуе Вера Багайчук. — Часам з'яўляюцца і прапановы, якія мы ўлічваем.

Печы ў цэхах «Дамачая» не астываюць ніколі: прадпрыемства працуе кругласутачна, у дзве змены, каб і раніцай, і ўвечары на стале ў беларусаў была свежая выпечка. Прадукцыя ААТ «Дамачай» адпраўляецца ў крамы па ўсёй Беларусі і далёка за яе межы: на экспарт штомесяц накіроўваецца звыш 100 тон.

## СМАК І КОЛЕР

Які хлеб у прыярытэце ў беларускага спажыўца? Часцей за ўсё ў гэтым пытанні людзі кансерватыўныя. Любыя абнаўленні «класікі» выклікаюць цікавасць: што дадалі або выдалілі са звыклага рэцэпта? Чаму ў назве папулярнага батона з'явілася слова «новы»?

Сучасныя віды класічнага хлеба — найбольш часты выбар па ўсёй краіне, сцвярджаюць на «Дамачаі». Менавіта такі хлеб на стале і ў Прэзідэнта, расказалі на прадпрыемстве. Аднак, як і ў любой гастранамічнай сферы, у пытанні выбару хлебабулачных вырабаў сярод беларускіх спажыўцоў нямала тых, хто сочыць за фуд-трэндамі або проста любіць каштаваць новае. Для прыхільнікаў канцэпцыі правільнага харчавання ў цэхах прадпрыемства выпякаюць хлеб нярэдка з зусім нечаканымі дабаўкамі.

Усяго на «Дамачаі» (у кампаніі тры буйныя вытворчасці ў Магілёве, тры філіялы і тры вытворчыя ўчасткі па вобласці) працуе каля паўтары тысячы чалавек, у асноўным гэта жанчыны. Цікавае назіранне: практычна ўсе яны — стройныя, хоць хлеб лічыцца прадуктам каларыйным. Якасны хлеб, створаны з дэталёвым выкананнем тэхналогій, без кансервантаў і хімічных дабавак у складзе, не псуе фігуру, расказалі нам работніцы ААТ «Дамачай». І мы ім верым!

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**







# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## О ПРОЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА ОБЪЕКТА **«Застройка микрорайона Северный в г. Минске». 4-я очередь.** Жилые дома № 1.6, № 1.7, № 2.6, № 2.7, № 2.8, № 2.9, № 2.10 по г/п

**Информация о застройщике**

Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник – четверг – 8.30–17.30, пятница – 8.30 – 16.15, обед – 12.45 – 13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 26 по ул. Сергея Есенина, фактический срок строительства – 12 месяцев.
2. Жилой дом № 28 по ул. Сергея Есенина, фактический срок строительства – 12 месяцев.
3. Жилой дом № 6 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 9 месяцев.
4. Жилой дом № 7 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 9 месяцев.
5. Жилой дом № 8 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 9 месяцев.
6. Жилой дом № 9 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 9 месяцев.
7. Жилой дом № 10 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 9 месяцев.
8. Жилой дом № 11 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 9 месяцев.
9. Жилой дом № 12 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 9 месяцев.
10. Жилой дом № 1 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 6 месяцев.
11. Жилой дом № 3 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 6 месяцев.
12. Жилой дом № 5 по ул. Ивана Науменко, фактический срок строительства – 6 месяцев.

**Информация о проекте и об объекте строительства**

Цель проекта – строительство блокированного жилого дома для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, с учетом очередности принятия их на такой учет, а также их права на внеочередное получение государственной поддержки, по направлениям соответствующих администраций; при невостребованности – для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях г. Минска, организациях г. Минска, без выдачи таких направлений, при наличии справки о постановке на учет нуждающихся в улучшении жилищных условий в г. Минске.

Положительное заключение государственной экспертизы от 14.02.2024 № 1210-15/23, от 13.06.2024 № 318-15/24.

Местоположение строящихся блокированных жилых домов – г. Минск, Центральный район.

**Характеристика объекта**

Строительным проектом объекта застройки микрорайона Северный 4-й очереди строительства предусматривается возведение семи блокированных жилых домов: одиннадцатиквартирные – № 1.6, № 1.7 по генплану; двухквартирные – № 2.6, № 2.7, № 2.8, № 2.9, № 2.10 по генплану.

Квартиры в жилых домах двухэтажные, без подземного этажа и чердака, с плоской кровлей из битумно-полимерных рулонных материалов по железобетонным плитам покрытия, с организованным наружным водостоком.

Наружные и внутренние стены приняты из железобетонных панелей, наружные стены утеплены минераловатными плитами. Перегородки – каркасные с облицовкой листами гипсокартона.

Квартиры предназначены для заключения договоров создания объектов долевого строительства с гражданами, в первую очередь многодетными семьями, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, по направлениям соответствующих администраций районов г. Минска, при невостребованности – с гражданами, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях г. Минска, организациях г. Минска (без выдачи таких направлений при наличии справки о постановке на учет нуждающихся в улучшении жилищных условий в г. Минске).

Квартиры строятся с установкой межкомнатных дверных блоков, устройством внутренней отделки (оклейка стен и перегородок обоями; облицовка керамической плиткой; покраска акриловой краской стен в мини-котельной; покрытие полов плиткой керамической в санузлах, мини-котельной; линолеум в жилых комнатах, гостиной, холле, коридоре), установкой сантехнического оборудования с необходимой водопроводной арматурой (умывальники керамические, ванна акриловая с экраном, мойка стальная, унитаз), установкой электрополотенцесушителя, установкой светодиодных светильников для освещения санузлов, мини-котельной, террасы, установкой патронов под приборы освещения в кухне и холле, установкой электрической плиты.

Стены: наружные, внутренние – железобетонные панели. Перекрытия – железобетонные.

Планировочные решения квартир выполнены с выделением внутриквартирными перегородками на первом этаже холла, санузла и мини-котельной. Из общего пространства гостиной организован выход на террасу. Функциональная зона кухни и гостиной обозначена условной линией. На втором этаже каждой квартиры расположены: в ж. д. № 1.6, № 2.6, № 2.7 по две жилые комнаты, гардеробная, санузел, коридор; в ж. д. № 1.7, № 2.8, № 2.9, № 2.10 – по три жилые комнаты, санузел, коридор.

Для поэтажного сообщения запроектирована открытая внутренняя лестница.

Оконные блоки – из ПВХ-профиля с заполнением двухкамерными стеклопакетами.

Дверные блоки наружные – из алюминиевого профиля с заполнением стеклом многослойным безопасным.

Наружная отделка жилых домов выполняется в составе системы утепления «вентфасад» с облицовкой стен из керамогранитных плит и покраской цоколя фасадной краской.

В жилых домах запроектирована водяная двухтрубная горизонтальная поквартирная система отопления. Трубы проложены в конструкции пола в изоляции. В качестве отопительных приборов приняты стальные панельные радиаторы. Теплоснабжение жилых домов осуществляется от двухконтурного газового котла.

Электроснабжение – скрытая проводка.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее (от газового котла) и холодное водоснабжение.

Стоимость 1 м$^2$ общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, в первую очередь многодетных семей, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, с учетом очередности принятия их на такой учет, а также их права на внеочередное получение государственной поддержки, по направлениям соответствующих администраций районов г. Минска, а при невостребованности – для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, организациях г. Минска, без выдачи направлений, при наличии справки о постановке на учет нуждающихся в улучшении жилищных условий в г. Минске,: в ж. д. № 1.6 по генплану – 3 913,85 бел. руб.; в ж. д. № 1.7 по генплану – 3 991,12 бел. руб.; в ж. д. № 2.6 по генплану – 4 303,28 бел. руб.; в ж. д. № 2.7 по генплану – 4 479,93 бел. руб.; в ж. д. № 2.8 по генплану – 4 544,48 бел. руб.; в ж. д. № 2.9 по генплану – 4 574,66 бел. руб.; в ж. д. № 2.10 по генплану – 4 448,02 бел. руб.

Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 1901 от 18 мая 2025 года, свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 20 марта 2025 года № 500/1802-14812, площадь земельного участка 10,1767 га. Благоустройство – согласно проектной документации.

Количество квартир в объекте строительства – 32.

Начало строительства объекта «Застройка микрорайона Северный в г. Минске». 4-я очередь. Жилые дома № 1.6, № 1.7, № 2.6, № 2.7, № 2.8, № 2.9, № 2.10 по г/п – 2-й квартал 2025 года, предполагаемый ввод объекта в эксплуатацию – 1-й квартал 2026 года.

Строительство дома осуществляется застройщиком на основании решения Мингорисполкома № 1901 от 18 мая 2025 года собственными силами без заключения договоров подряда.

Строительство осуществляется согласно Кодексу Республики Беларусь об архитектурной, градостроительной и строительной деятельности. Гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается **32 квартиры:** в ж. д. № 1.6, № 1.7 – по 4 квартиры общей площадью 108,21 м$^2$ жилой площадью 58,53 м$^2$, по 7 квартир общей площадью 108,03 м$^2$ жилой площадью 58,53 м$^2$; в ж. д. № 2.6, № 2.7, № 2.8, № 2.9, № 2.10 – по 2 квартиры общей площадью 107,97 м$^2$ жилой площадью 58,53 м$^2$.

**Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир**

Прием заявлений от граждан осуществляется отделом реализации недвижимости ОАО «МАПИД» (г. Минск, пр-т Жукова, 6, кабинет № 1, тел. 209-87-52) **с 26 июня 2025 года** ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, понедельник–четверг с 9.00 до 17.00, обед с 12.45 до 13.30, в пятницу с 9.00 до 15.00, обед с 12.45 до 13.30.

Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина, его паспорт и направление администрации района г. Минска на строительство квартиры.

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение пяти календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и ОАО «МАПИД» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим гражданином.

Ознакомиться с планировками квартир можно на сайте ОАО «МАПИД» **www.mapid.by.**

# ПАТРЫЯТЫЗМ СПАЖЫВЕЦКАГА КОШЫКА



## Мы не настолькі багатыя і не такія бедныя, каб купляць звыштанныя прадукты сумнiўнай якасці

**Няёмка нават казаць, але на беларускім спажывецкім рынку зашмат прадаецца імпартных тавараў. І з кожным годам іх доля імкнецца да павелічэння. І калі ў сегменце нехарчовых тавараў гэту тэндэнцыю яшчэ неяк можна растлумачыць: даходы не так хутка, як хацелася б, але павялічваюцца. Адпаведна спажывецкі кошык пашыраецца: ужо амаль усе абзавяліся ноўтбукамі, смартфонамі і іншымі гаджэтамі, а іх у Беларусі практычна не вырабляюць. Але чаму зніжаецца доля продажу айчынных прадуктаў харчавання?! Гэта катэгорыя ў нас развіта вельмі нават нядрэнна, у шырокім асартыменце і разнастайнасці. Магчыма, справа не толькі ў канкурэнтаздольнасці, але і ў дэфіцыце спажывецкага патрыятызму. А без жадання купляць роднае дастаткова праблематычна дабіцца вялікіх вынікаў.**



Уласна кажучы, у імпарце няма нічога дрэннага. І яго неабходнасць не выклікае сумненняў. Толькі крыху насцярожваюць аб'ёмы яго рэалізацыі. І той жывы водгук, які знаходзяць у спажыўца замежныя гандлёвыя маркі. Прычым прырост адбываецца, наколькі разумею, не за кошт вядомых брэндаў. Хутчэй, бяруць нас замежнікі цаной, але зусім не якасцю. А калі больш карэктна — не спажывецкімі вартасцямі.

Непасрэдна за бяспекай прадукцыі, якая паступае на беларускі рынак, пільна сочаць кантрольныя і наглядныя органы. І калі знаходзяць парушэнні і неадпаведнасці, то бязлітасна разварочваюць партыі сумніўных тавараў або знімаюць іх з паліц. Іншае пытанне, што імпартная прадукцыя нярэдка прайграе айчыннай з пункту гледжання экалагічнасці і натуральнасці. Але за кошт дысконтнай цаны знаходзіць свайго пакупніка.

Канкурэнцыя ёсць канкурэнцыя: быццам бы ніхто не перашкаджае і нашым кампаніям асвойваць асартымент эканом-сегмента. Аднак усё не так проста, як падаецца. Можна зрабіць танна і сярдзіта, але не вельмі смачна ў гурманскім разуменні гэтага тэрміна. Думаю, для нашых тэхнолагаў і спецыялістаў не вельмі складана з годнай рэцэптуры зрабіць сурагатную. І ўсё ж імідж даражэйшы, чым павелічэнне продажаў на некалькі працэнтных пунктаў. Беларусь жа славіцца высокімі стандартамі ў сферы вытворчасці прадуктаў харчавання. За гэта іх і цэняць — і нашы госці, і спажыўцы на замежных рынках. Больш за тое нашы гандлёвыя маркі часта падробліваюць. А таксама пад маркай беларускіх брэндаў рэалізуюць прадукцыю, выпушчаную ў іншых дзяржавах. Дабіцца такой павагі пакупнікоў, распешчаных вялізнай прапановай, дарагога варта.

Таму і стаіць перад нашымі вытворцамі няпростая дылема: зніжаць звыклую планку па якасных характарыстыках або канкураваць па цане з замежнымі калегамі. Большасць выбірае варыянт утрымання высокай маркі добрасумленнага вытворцы. І ад гэтага церпяць на ўнутраным рынку. Праўда, дабіраюць неабходныя аб'ёмы продажу па экспартных напрамках.

Іншае пытанне: чаму нас, спажыўцоў, не хвалюе гэта тэндэнцыя? Канкурэнцыя, вядома, выдатная з'ява: дае пакупнікам выбар. Па якіх крытэрыях выбіраць брэнд, ён ужо сам вызначыць. Праблема толькі ў тым, што канкурэнцыя, калі яна ўжо занадта заўзятая, не павышае якасць прадукцыі, а, наадварот, яе змяншае. Спаборніцтва за нізкую цану цягне за сабой незаўважны пераход на зыбкую глебу прымянення розных хітрыкаў, якія заключаюцца ў вытворчасці прадуктаў харчавання па танных рэцэптурах, але так, каб не адрозніць ад сапраўдных. Якасныя прадукты ў бытавым разуменні гэтага слова не могуць быць зусім таннымі. Па азначэнні. І натуральная прадукцыя ў свеце каштуе або дорага, або вельмі дорага. Гульні ж у дысконт вядуць да вялікай колькасці тавару з сумнiўнымі якаснымі характарыстыкамі. Гэткі варыянт некаторых еўрапейскіх краін, калі розны прадукцыі шмат, не вельмі дарагой, але настолькі ж не вельмі і смачнай. Праўда, гандлёвыя сеткі на такім асартыменце нядрэнна зарабляюць.

Канешне, заўсёды ёсць апраўданне: так галасуе рублём спажывец. Але ў гэтым сцвярджэнні ўсё менш ісціны. Хоць з той простай прычыны, што мудрагелісты маркетынг заўсёды здольны несправакаванага пакупніка калі не падмануць, то падштурхнуць да памылкі. Ці ўсе ўважліва чытаюць склад прадукту на ўпакоўцы? Нават калі і прыглядаюцца, то там усё доўга, заблытана і незразумела. Прынамсі, для недасведчаных. Па сутнасці, у сучасным высокатэхналагічным свеце толькі тэхнолагу ўжо пад сілу разабраць, які прадукт з'яўляецца прымальным па колькасці інгрэдыентаў, а які лепш на талерку не класці. Шкоднага эфекту не будзе, але і станоўчага не дачакаешся. Таму спадзявацца на спажывецкую свядомасць ужо ў значнай ступені некарэктна. Мы жывём у век, насычаны інфармацыяй. Прычым яе валоданне ў поўнай меры з'яўляецца асіметрычным. Вытворца і прадавец апрыёры ведаюць на некалькі парадкаў больш, чым пакупнік. І ў гэтай няроўнай барацьбе ў апошняга ёсць права галасавання кашальком. Але цяжка сказаць, да якой ступені яно асэнсаванае.

Ці не час больш актыўна выхоўваць спажывецкі патрыятызм?! І калі ёсць больш-менш раўнацэнны выбар, усё ж набываць айчыннае. Не каб дапамагчы роднаму прадпрыемству рублём (хоць гэта высакароднае імкненне таксама не варта зусім выключаць з матывацыі), але каб захаваць нашу мадэль спажывецкага рынку, накіраваную на безумоўную якасць. У рэшце рэшт, натуральнасць і якасць прадуктаў харчавання — гэта здароўе і якасць жыцця ў доўгатэрміновай перспектыве. І той факт, што мы не сышлі ў надта сучасныя і высокія тэхналогіі, перанасычаныя харчовай хіміяй, — вельмі значнае дасягненне. Для нас гэта выглядае абсалютна звыклым. Таму іншы раз мы можам і пабурчаць з нейкіх аб'ектыўных ці надуманых падстаў. Тым не менш нашы госці і з усходу, і з захаду вельмі нават адчуваюць розніцу. І хацелася б гэту розніцу захаваць. Мы ж не настолькі багатыя і не такія бедныя, каб купляць звыштанныя прадукты. Пакуль наш вытворцы трымаюць абарону. Але з кожным годам ім становіцца ўсё цяжэй рабіць гэта. Паўтаруся: справа тут не толькі ў эканоміцы, нейкіх лічбах і паказчыках, але ў тым экасяроддзі спажывецкага рынку, якое ў нас сфарміравалася і якое мы можам страціць. А потым будзем пра яго ўспамінаць з настальгіяй і шкадаваннем. Як сёння аб савецкіх прадуктах, якія былі не вельмі разнастайнымі, з кароткім тэрмінам захоўвання, затое з мінімумам дабавак. Дакладней, апошніх увогуле не было сярод інгрэдыентаў. Мы гэта зразумелі, калі спажывецкі рынак перайшоў на новыя рэйкі. У беларускім выпадку ўдалося застацца ў якаснай каляіне. І вельмі хацелася б з яе не вылецець. У рэшце рэшт якасныя прадукты харчавання (не толькі ў вытворчасці, але і на паліцах крам) з'яўляюцца адным з брэндаў Беларусі. І будзе сапраўды патрыятычна яго захаваць. І за спажыўцом застаецца далёка не апошняе слова.



Інтэлект ШТУЧНЫ

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## ПО ОБЪЕКТУ «Застройка территории в границах ул. М. Лынькова – П. Глебки – проезд Масюковщина. Квартал № 4». 4-я очередь строительства. Многоквартирный жилой дом № 7 по генплану

**Застройщик** – государственное предприятие «УКС Запад», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 05.01.2015 за № 192400611.

Местонахождение: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Сергея Есенина, 4-107, тел.: (8017) 399 53 94; (8017) 370 84 18, (8017) 234 16 98, (8044) 785 84 81, (8029) 323 11 11, (8029) 795 44 44.

Режим работы офиса продаж (ул. Сергея Есенина, 6, офис 213) – приемное время: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница – с 8.30 до 16.15, обеденный перерыв с 13.00 до 13.45; выходные дни: суббота, воскресенье.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1) Жилой дом № 17 по ул. Юрия Семеняко;
2) Жилой дом № 50 по ул. Маршала Лосика;
3) Жилой дом № 35 по ул. Академика Карского;
4) Жилой дом № 33 по ул. Академика Карского;
5) Жилой дом № 44 по ул. Академика Карского
6) Жилой дом № 4Е по ул. Семашко;
7) Жилой дом № 19 по ул. Гризодубовой;
8) Жилой дом № 21 по ул. Гризодубовой;
9) Жилой дом № 30 по ул. Ромашкина;
10) Жилой дом № 32 по ул. Ромашкина;
11) Жилой дом № 34 по ул. Ромашкина;
12) Жилой дом № 26 по пр. Дзержинского;
13) Жилой дом № 13 по ул. Грушевской;
14) Жилой дом № 42 по ул. Щорса;
15) Жилой дом № 4В по ул. Семашко.

Застройщиком получены:
- акт выбора места размещения земельного участка, утвержденный председателем Минского городского исполнительного комитета 28.01.2021;
- заключение государственной экспертизы РУП «Главгосстройэкспертиза» от 28.08.2024 № 511-15/24;
- решение Мингорисполкома от 29.05.2025 № 2049 «Об изъятии, предоставлении земельного участка и разрешении строительства»;
- договор строительного подряда от 30.05.2025 № 12/01 с ОАО «МАПИД».

### Информация о проекте

Проектом предусмотрено строительство объекта «Застройка территории в границах ул. М. Лынькова – П. Глебки – проезд Масюковщина. Квартал № 4». 4-я очередь строительства. Многоквартирный жилой дом № 7 по генплану.

Многоквартирный жилой дом № 7 по генплану – 3-секционный, 10-этажный, с техподпольем и теплым чердаком, с плоской рулонной кровлей с внутренним водостоком, без мусоропровода. Здание запроектировано в сборных конструкциях серии М-464-У1М.

В техническом подполье размещены технические помещения (электрощитовая, ИТП, водомерный узел, пункт учета тепла). На первом этаже расположены входные группы жилого дома, 1-, 2-, 3-комнатные квартиры. Всего в жилом доме 120 квартир. Состав квартир: прихожая, жилые комнаты, кухня, санузел, ванная комната; в части квартир – кладовая. В каждой квартире имеется не менее одного летнего помещения (лоджия).

Входные группы каждой секции состоят из теплового тамбура, холла, лестнично-лифтового узла, подсобных помещений (колясочной, помещения уборочного инвентаря). Подъезды предусмотрены проходными, во всех секциях организован второй выход на прилегающую территорию.

В каждой секции жилого дома запроектирована лестничная клетка и лифтовая установка.

Лоджии запроектированы с остеклением. Элементы остекления лоджий – из ПВХ профиля, заполнение нижней не открывающейся части – многослойным безопасным стеклом. Окна и балконные двери предусмотрены из профиля ПВХ с заполнением двухкамерными стеклопакетами, оснащены детскими замками безопасности и вентиляционными устройствами.

Внутренняя отделка:
стены – оклейка обоями;
потолки – жилые комнаты, прихожие, кухни, кладовые – окраска акриловой краской;
полы – линолеум на теплоизолирующей основе.

Санузлы, ванные комнаты: потолки, стены – окраска водно-дисперсионной акриловой краской, полы – керамическая плитка.

Система отопления запроектирована двухтрубная поквартирная с установкой узлов учета тепла для каждой квартиры. В качестве нагревательных приборов приняты стальные радиаторы. В каждой квартире устанавливается электроплита.

Места общего пользования

Отделка: полы – керамическая неглазурованная плитка; стены – покрытие защитно-декоративным полимерным составом; потолки – покраска акриловой краской.

В состав общего имущества объекта входят водомерный узел, ИТП, электрощитовая, коридоры общего пользования, лестницы, лестничные клетки, лифты, лифтовые и иные шахты, кровля, другие места общего пользования, ограждающие несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся за пределами или внутри жилых помещений, иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Застройщик передает общее имущество совместного домовладения (жилого дома) после приемки в эксплуатацию объекта лицу, уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

В соответствии с решением Мингорисполкома от 29.05.2025 № 2049 «Об изъятии и предоставлении земельных участков и разрешении строительства» строительство жилых помещений жилого дома осуществляется в установленном порядке для граждан, на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, по направлениям соответствующих администраций районов г. Минска.

Для привлечения к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются 120 квартир для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, по направлениям соответствующих администраций районов, в том числе:
- 3 однокомнатные квартиры;
- 57 двухкомнатных квартир;
- 60 трехкомнатных квартир.

Цена 1 кв. метра общей площади объекта долевого строительства в жилом доме № 7 по генплану на дату опубликования проектной декларации с учетом прогнозных индексов составляет 2 364,95 бел. рублей.

Начало строительства – сентябрь 2025 года. Нормативная продолжительность строительства – 9,5 месяца. Планируемый срок ввода объекта в эксплуатацию – II квартал 2026 года.

Для заключения договора необходимо:
- личное присутствие и паспорт (идентификационная карта) лица, с которым будет заключаться договор, паспорт и доверенность, оформленная в установленном законодательством порядке (при заключении договора представителем);
- направление на строительство администрации района г. Минска;
- справка о состоянии на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

Документы для заключения договоров будут приниматься и регистрироваться с 15 июля 2025 года в соответствии с режимом работы офиса продаж по адресу: г. Минск, ул. Сергея Есинина, 6, офис 213.

ПА СУТНАСЦІ

# РАБОТЫ ЎСІМ ХОПІЦЬ



Памятаеце, калісьці ў нас слова «імпарт» вымаўлялі ледзь не з прыдыханнем. А сёння беларусы пабудавалі паўнаважкую эканоміку экспарту. Нашы брэнды і кампетэнцыі неабходныя ў розных кутках свету. А нам патрэбны працоўныя рэсурсы. Гэта яшчэ і сучасная прыкмета новага тэхналагічнага ўкладу.

Вось, калі коратка, увесь сэнс міграцыйнага пытання. Недавер і асцярога зразумелыя. Еўрапейскі досвед, мякка кажучы, зусім не ўражвае, і, што адметна, пра яго «рэжысёры» міграцыйных фэйкаў, спрацыяваных на Беларусь, не згадваюць, калі вяшчаюць з той жа Еўропы. Яны не ўлічваюць нашы рэаліі, хутчэй за ўсё, наўмысна іх ігнаруюць. А ў Беларусі выбудавана эфектыўная сістэма — ад агульнай да міграцыйнай бяспекі. Наша краіна кіравана, і дыктатура эфектыўнасці ўжо неаднойчы даказала сваю сілу. Але што самае важнае: мы ж прымаем не правапарушальнікаў, а падаткаплацельшчыкаў. Ніхто па дапамогу па беспрацоўі ў Беларусь не едзе. Ды і нікому не дадуць.

Беларусь у гэтым сэнсе — вельмі прывабная краіна. Да нас едуць, аднак не толькі адпачываць — жыць. Украінцы ратуюцца ад вайны, еўрапейцы — ад акупацыі дэвіянтных сэнсаў. Часта мы не заўважаем таго, што маем, чым замежнікі так захапляюцца, калі прыязджаюць у Беларусь. Мы прагнем вялікіх даходаў, але не імкнёмся іх зарабіць. Атрымаўшы бясплатную і якасную адукацыю і кампетэнцыі, стаўшы на крыло, мы з касмапалітычным запалам бэсцім родны кут і шукаем сябе ў чужых лакацыях. А там багаж кампетэнцый пакрываецца пылам у цесным здымным пакойчыку, а кваліфікаваны спецыяліст займаецца самай нізкааплатнай работай. Такія рэаліі жыцця пад чужым небам. Зберлыя бадзяюцца па да таго прывабных для іх «эўропах» у паўгаладным стане і стогнуць па страчаным зямным раі. Евангельскі сюжэт прытчы аб блудным сыне ў дзеянні — не толькі цікавы, але і павучальны. Усім варта задумацца.

Працоўныя рэсурсы — залог развіцця эканомікі. Гэта насамрэч стратэгічнае пытанне. Мы прымаем мігрантаў з павагай, у асноўным сем'і. Заробкі, жыллё, сацыяльная інфраструктура — прапануем належныя ўмовы, таму разлічваем на адпаведную аддачу. Тым больш што шмат дзе ў нас ужо старанна працуюць замежнікі. Досвед той жа Гомельшчыны паказаў: мігранты — перадавікі. Зразумела, павінен быць кантроль, каб усе працавалі на роўных умовах у рамках закона. І патрабаванні тут жорсткія: парушыў — пакуй чамаданы. А калі з усёй душой і жаданнем працаваць, то, калі ласка, работы ўсім хопіць.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**



Неасабісты суб'ектыў

# ПРОСТАЯ РАДАСЦЬ ВЯРТАННЯ

## Сэнсы, якія знаходзіш у вясковым адпачынку

*«Ну, як адпачынак?» — зацікаўлена пытаюцца калегі і знаёмыя, чакаючы, напэўна, пачуць аповед калі не пра падарожжа ў далёкую цёплую краіну, дык пра дзянькі, праведзеныя ў санаторыі. «Выдатна — была дома, у вёсцы», — адказваю. І бачу, як цікавасць знікае і слухаць мяне надта ніхто і не хоча... І як ім патлумачыць, што ў гэтым банальным, як яны думаюць, адпачынку столькі ўражанняў, столькі сэнсаў, што ніякія заморскія краіны і блізка не ставілі.*

І далёка ехаць не трэба — крыху больш за паўгадзіны ад тлумнай сталіцы — і ты ўжо ў іншай рэальнасці. Іншыя ўмовы — какафонія дурнаватых птушыных спеваў у пранізлівай цішыні, начная цемра, густая і чорная, у якой па першым часе засынаецца крыху насцярожана, але праз два дні ўжо з асалодай праваліваешся ў яе, толькі дакрануўшыся галавой да падушкі. Іншыя клопаты — накрыць памідоры, высаджаныя ў цяплцы, бо тэлефон паказвае, што на досвітку будзе мінус адзін, але разумееш, што будзе і ўсе мінус пяць; падпаліць спачатку ў вялікай печы, пасля ў грубцы, бо і на вуліцы холадна, і адсырэлая за зіму хата дыхае вільгаццю; пільнаваць, каб гарадская кошка, якая ў Мінску нічога, акрамя прэміяльнага корму не есць, не прынесла зноў у хату мыш і не зжэрла яе з апетытам прама на дыване ў зале... Іншы рытм жыцця — здаецца, і работы шмат, але ўсё больш размерана, не мітусліва. Уключаецца спрадвечнае вясковае разуменне: будзеш лапатаць — хутка зморышся і паспееш нашмат менш, бо фізічная праца — гэта не пальцамі па клавіятуры скакаць... Карацей, што-што, а мазгі адпачываюць вельмі нават.

Зрэшты, не гэта галоўнае. Галоўнае — вяртанне дадому. Вось гэта ні з чым не параўнальнае адчуванне, калі заходзіш у хату, ставіш на падлогу прывезеныя валізкі — і разам з імі нібы скідваеш з плячэй усё, што хвалявала, непакоіла, бянтэжыла ў горадзе, — цяжар, які за зіму стаў амаль непад'ёмным. І міжволі сам сябе пытаеш: а калі б не было гэтай вёскі, гэтай хаты, дзе вось так проста ты яго скідаеш? Ці доўга б пратрымаўся на нагах? Ці доўга пратрымаўся б увогуле?..

У гэтай простай радасці вяртання на радзіму сапраўды шмат сэнсаў. Навват нечаканых для цябе самога, у самых звычайных, будзённых рэчах. Вось, напрыклад, сёлета вырашыла засыпаць барозны на агародзе пілавіннем. Балазе, у вёсцы ёсць невялікае дрэваапрацоўчае прадпрыемства, таму гэтага дабра хапае, і па дэмакратычнай цане. (Дарэчы, падзяліся лайфхакам з першых вуснаў ад «народнага садоўніка» Дзмітрыя Кастрыцкага, якога многія ведаюць па рубрыцы ў тыднёвым прагнозе надвор'я на АНТ. Каб пілавінне не закісляла глебу, дастаткова яго пасыпаць даламітавай мукой; каб не забірала ў раслін азот — трэба паліць яго слабым растворам любога азотнага ўгнаення.) Здавалася б, звычайная работа — награбай і нясі на агарод. Але ж удыхнула свежы духмяны водар смалістага дрэва — і нібы вярнулася ў дзяцінства, калі з бабуляй хадзілі па апілкі на «завод» на падсціл скаціне, награбалі іх у вялікі мяшок-«кітаец»... І так хораша было ехаць верхам на гэтым поўным духмяным мяшку, які бабуля цягнула на санках... Вось ці будуць у каго з сучасных, нават вясковых, дзяцей такія ўспаміны, ад якіх праз дзесяцігоддзі цяплее і харашэе на душы? Пра тыя ж жоўтыя духмяныя апілкі, пра мяккую пысу каня, якога з далоні частаваў кавалкам цукру, пра ягады малін у першых промнях сонца, пра першую рыбку, якую злавіў на самаробную вуду з ляшчыны?.. Ці ў іх успамінах будуць толькі кадры з TikTok і гульні ў «Майнкрафт»? Бедныя дзеці, якія калісьці стануць дарослымі...

Павольна едзе па вуліцы вялізны смеццявоз. «Забярыце і маё!» — крычу ад брамкі ўсмешліваму дзядзьку, які кідае смецце ў жалезнае чэрава машыны... Ён спрытна падхоплівае пакеты, машына павольна паўзе далей. Добра, што яна ёсць. Чыста і на вясковых падворках, і на ўзлесках каля вёскі. Дастаткова, каб два разы на месяц прыехала машына. Цана пытання — тры рублі за той жа месяц. Грошай, думаю, ніхто не шкадуе — яно таго варта. Да такога вось аптымальнага рашэння такой актуальнай на сёння — аж да абмеркавання на вышэйшым узроўні — праблемы ішлі доўга, метадам спроб і памылак. Спачатку афіцыйным палігонам быў адпрацаваны кар'ер дзесьці за кіламетр ад вёскі, да якога многія свае адходы проста не давозілі. Імі быў засыпаны ўвесь лес на беразе возера — любімае месца адпачынку мясцічаў і прыезджых. Пасля, калі па ўсёй Міншчыне міні-палігоны ліквідавалі, засыпалі і кар'ер. Паставілі па вёсцы некалькі кантэйнераў, якія напаўняліся вельмі хутка, вывозіліся рэдка, таму большасць смецця зноў везлі або ў лес, або ва ўжо засыпаны кар'ер. Эстэтыкі наваколлю гэта не дабавіла. Затое цяпер усё чыста і прыгожа. А ўсяго толькі і трэба было — знайсці адну машыну і скласці графік яе прыезду ў пэўны населены пункт... Вось цікава: чаму простыя рашэнні знаходзіць так складана?..

Ляжаць на ўзбочыне вуліцы трубы вялікага дыяметра — зноў хтосьці вядзе каналізацыю. Аб гэтым, як і аб тым, што ў невялікай вёсцы будзе прыродны газ, яшчэ некалькі гадоў таму і думаць ніхто не думаў. Праўда, цяпер з усімі тымі камунікацыйнымі навінкамі праблема іншая: дзяды і бацькі сённяшніх гаспадароў будавалі хаты і хлеўчыкі без разліку на тое, што ў суседзяў будзе каналізацыя, якая вымагае пэўнай адлегласці ад пабудовы ці ад іншага ўчастка... Спадчынікі ж вырашаюць пытанне па-рознаму: хтосьці дамаўляецца па-добраму, саступаючы той лішні метр зямлі суседу; хтосьці сварыцца і судзіцца; хтосьці робіць, як патрэбна яму, а сусед ад такога нахабства проста ў ступары... А тут жа яшчэ зямельная амністыя працягваецца. І ўсе спяшаюцца афарміць тое, што аформлена не было, і зноў нярэдка ўсё ўпіраецца ў межы. І тады зноў прыязджаюць важныя землямеры, ходзяць са сваімі прыладамі, а бакі канфлікту насцярожана пазіраюць адно на аднаго з-за плота... Карацей, чалавечая камедыя ў мініяцюры.

І каб вы ведалі, як яна мне падабаецца! Бо гэты спрэчкі, межы — неад'емная частка вясковага жыцця, толькі нашы бабулі спрачаліся з-за курэй, якія пагрэблі суседскія грады, а мы — з-за каналізацыйнай трубы. Сутнасць, сэнс адзін, вельмі важны, — нам не ўсё роўна. Мы гаспадары на гэтай зямлі, нас сюды цягне з вялікага горада, мы цвёрда стаім на ёй, бо тут нашы карані. Таму і імкнёмся сюды, таму і кажам, што тут, на ёй — месца сілы...

А «народны садоўнік» Дзіма, які жыве праз некалькі хат (менавіта тут, на ўчастку, здымаюцца ўсе сюжэты яго рубрыкі), расказаў, што сёлета ў вёсцы зімавала дваццаць пяць чалавек. (Гадоў дзесяць таму быў гістарычны мінімум — васямнаццаць, і надзеі, што гэта лічба зменіцца ў лепшы бок, амаль не было.) І гэта навіна, пачутая ад яго, была самай лепшай навіной майго выдатнага майскага адпачынку.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении повторных
электронных торгов по продаже имущества,
принадлежащего
**КУП «Миноблавтосервис»** (Продавец)
на праве хозяйственного ведения

**Электронные торги состоятся 17.06.2025.**

**Лот № 1:** TOYOTA LAND-CRUISER,
кузов (рама) № JTEBU3FJ50K012062, 2010 г.в.

Начальная цена с НДС 20 % – 46 584,00 руб.

**Местонахождение:** г. Минск, ул. Петруся Бровки, 27.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета minsk-region.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 www.ipmtorgi.by |
|---|---|
| **Продавец** | ИП Рудаков В.В., УНП 193331457 |

| **Предмет электронных торгов: оборудование (б/у), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 19** | **Начальная цена без НДС, бел. руб.** |
|---|---|
| **Лот № 1.** Станок токарно-винторезный 16К40 Ф101, РМЦ3000 мм (в комплекте с патроном, люнетами, центр упорный) | **45 100,00** |
| **Лот № 2.** Станок фрезерный широко универсальный FWD 32J (пр-во Польша) | **11 800,00** |
| **Лот № 3.** Станок токарно-винторезный JET GH-1840 X РМЦ 1015 мм (отверстие в шпинделе ф 80 мм, каленая станина, выемка в станине, с люнетами, патрон 4-, 3-кулачковый, планшайба, центр упорный вращающий) | **13 650,00** |
| **Лот № 4.** Станок консульно-фрезерный широко универсальный 6Р82Ш (с долбежной головкой) | **8 600,00** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату внесения платежа на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **8–10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов (подробная информация в карточке лота на ЭТП «ИПМ-Торги»)

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов:**
**01.07.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **30.06.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |
|---|---|

# ЕЎРАПЕЙСКІЯ ФЕРМЕРЫ ПЛАЧУЦЬ, СПАЖЫЎЦЫ ПЛАЦЯЦЬ

## Чым павернуцца для ЕС новыя пошліны на нашы ўгнаенні і сельгаспрадукцыю

Еўрапейская камісія ў рамках чарговага, ужо сямнаццатага, пакета санкцый уводзіць новыя абмежаванні на аграэкспарт з Беларусі і Расіі. Цяпер пад прыцэл трапілі вытворцы азотных угнаенняў і сельгаспрадукцыя.

Пошліна ў памеры 50 % уводзіцца на цукар, воцат, муку і кармы для жывёл. Для мяса, малочкі і гародніны ўвазныя пошліны паднімуць на 15 %. На азотныя ўгнаенні да дзейнага адвалорнага кампанента пошлін (працэнтнай стаўкі ад мытнага кошту) у 6,5 % дададуць спецыфічны падатак (фіксаваная мінімальная сума), які будзе паступова павялічвацца. 3 1 ліпеня 2025 года да 30 чэрвеня 2026-га ён складзе € 40 за тону для азотных угнаенняў і € 45 за тону для змешаных з утрыманнем азоту. Да 2028 года новыя пошліны дасягнуць практычна забароннага ўзроўню ў € 315 для азотных угнаенняў і € 430 за тону складаных. Максімальны тарыф можа быць уведзены і раней, калі пастаўкі ўгнаенняў з РФ будуць вышэйшымі за вызначаны ўзровень. На 1 ліпеня 2025-га — 30 чэрвеня 2026 года парогавым значэннем устаноўлена 2,7 млн тон, на наступны сезон — 1,8 млн тон, на сезон 2027—2028 гадоў — 0,9 млн тон.

На пытанне, ці паўплываюць гэтыя чарговыя санкцыі на нас, фактычна адказаў Прэзідэнт. Падчас наведвання Нежынскага горна-абагачальнага комплексу ў Любанскім раёне Аляксандр Лукашэнка заявіў: «Увялі санкцыі супраць калійных угнаенняў. Ну і што? Немагчыма санкцыямі стрымаць развіццё любой краіны, нават невялікай. Немагчыма».

У сваю чаргу паспрабуем разабрацца ў матывацыі еўрачыноўнікаў і наступствах гэтага неардынарнага кроку.

**Па-першае.** Пры інтэнсіўным земляробстве, якім вызначаецца аграрная галіна ў еўрапейскіх краінах, азот адыгрывае асабліва важную ролю, паколькі натуральны нітраген у глебе высільваецца хутка. Таму з усіх відаў угнаенняў, якія прымяняюцца, азотныя складаюць каля 70 %, і чвэрць гэтага аб'ёму забяспечваюць вытворцы з Саюзнай дзяржавы.

**Па-другое.** Ключавы аргумент прыхільнікаў прынятых абмежаванняў — меры прывядуць да павелічэння ўнутранай вытворчасці ўгнаенняў. Аднак гэта толькі пажаданне. Еўропе даўно не хапае ўнутранай вытворчасці ўгнаенняў, у сувязі з чым іх імпарт непазбежны, прычым сітуацыя з часам толькі пагаршаецца з-за ўзмацнення жорсткасці кантролю за выкідамі вуглякіслага газу. Часткова замясціць саюзныя пастаўкі можа рост імпарту з Марока, Егіпта і Алжыра, на якія сукупна прыпадае прыкладна 35 % усяго імпарту азотных угнаенняў у ЕС у 2024 годзе.



Фота БелТА.

**Па-трэцяе.** Цана на азотныя ўгнаенні ў значнай ступені залежыць ад галоўнага кампанента вытворчасці — прыроднага газу. Выдаткі на яго могуць складаць каля 80 % ад агульнага аб'ёму сабекошту. Чым даражэйшы прыродны газ, тым даражэйшыя азотныя ўгнаенні. Скарачэнне вытворчасці ўгнаенняў у Еўропе пачалося яшчэ ў 2021 годзе, калі цэны на газ з пачаткам СВА выраслі ў некалькі разоў. І нават зніжэнне газавых каціровак да ўзроўню 400 долараў за тысячу кубаметраў не дазволіць еўрапейскім вытворцам самастойна забяспечыць патрэбу сваіх аграрыяў.

**Па-чацвёртае.** Рашэнне ЕС увесці так званыя «загараджальныя» пошліны ў памеры 100 % на расійскія і беларускія ўгнаенні — акт поўнасцю палітычны, паколькі, з пункту гледжання эканомікі, сельскагаспадарчы сектар краін ЕС, прычым пры любым развіцці сітуацыі, аказваецца ў пройгрышы.

Асацыяцыя еўрапейскіх фермераў Copa-Cogeca выступіла з заявай, у якой адзначыла: фермерскія супольнасці разумеюць і падтрымліваюць агульныя мэты інстытутаў ЕС, аднак лічаць, што «адсутнасць належнай увагі гэтых інстытутаў да альтэрнатыўных крыніц паставак і ацэнкі наступстваў прынятых мер застаюцца сур'ёзнымі праблемамі». І заклікала еўрапейскія ўлады і, у першую чаргу Еўракамісію, адкласці прымяненне новых абмежавальных мер на мінеральныя ўгнаенні і вывучыць магчымасць стварэння інструмента кіравання рызыкамі для ўсяго ланцужка паставак угнаенняў.

У адваротным выпадку еўрапейскія фермеры сутыкнуцца з сур'ёзнымі цяжкасцямі з-за ўведзеных ЕС пошлін на расійскія і беларускія ўгнаенні, што спраракуе рост цэн на ўсе віды ўгнаенняў. У выніку з-за гэтага палітычнага рашэння Бруселя фінансавы цяжар ляжа менавіта на сельгасвытворцаў і простых еўрапейцаў. «Мы не можам дазволіць сабе яшчэ больш падрываць эканамічную жыццяздольнасць ферм або харчовую бяспеку мільёнаў людзей па ўсім ЕС», — падвялі вынік у Copa-Cogeca.

**Па-пятае.** Для Беларусі і Расіі новыя пошліны ЕС прывядуць да пераразмеркавання часткі паставак на Бразілію, Мексіку, Індыю і ЗША. Імпартная ёмістасць індыйскага рынку азотных угнаенняў — 10 млн тон, Бразіліі — 14 млн тон, Афрыкі — 5 млн тон, і ў перспектыве попыт там будзе толькі павялічвацца. І гэта пры тым, што ўжо сёння амаль палова саюзнага экспарту ўгнаенняў прыпадае на краіны БРІКС.

Што датычыцца нашай краіны, то дзякуючы такім заводам-гігантам, як «Беларуськалій», «Гродна Азот» і «Гомельскі хімічны завод», Беларусь не толькі цалкам забяспечана мінеральнымі ўгнаеннямі, але і экспартуе іх у значнай колькасці. Пры гэтым унутраны рынак быў і застаецца ў прыярытэце для беларускіх вытворцаў угнаенняў.

Паказальным прыкладам таго, што планы Бруселя нанесці чарговы «зруйнавальны» ўдар па беларускай эканоміцы — марныя, з'яўляецца намер Індыі інвеставаць у «Гродна Азот» да $ 600 мільёнаў. Такім чынам гэта краіна хоча пашырыць вытворчасць азотных угнаенняў на гродзенскім прадпрыемстве і павялічыць гарантаваны аб'ём сваіх імпартных паставак.

*Міжнародная асацыяцыя вытворцаў і спажыўцоў угнаенняў (IFA) канстатуе, што агульны аб'ём сусветнага спажывання ўгнаенняў складае* ***203,8 млн тон:***

- **азотных — 56 %,**
- **фосфарных — 24 %,**
- **калійных — 20 %.**

**Што ў астатку?** Насуперак сцвярджэнням Еўракамісіі загараджальныя бар'еры на саюзныя мінеральныя ўгнаенні і сельгаспрадукцыю нададуць магутны імпульс махавіку глабальнай харчовай інфляцыі і прывядуць да скачка сусветных цэн на прадукты харчавання і мінеральныя ўгнаенні, ад якога перш за ўсё пацерпяць найбяднейшыя краіны, што развіваюцца.

Як адаб'юцца новыя абмежаванні на Еўропе і яе сельскай гаспадарцы, пакажа час. Аднак ужо сёння зразумела: рашэнне еўрадэпутатаў ударыць у першую чаргу не па беларускіх і расійскіх вытворцах, а па фермерах і радавых спажыўцах у самім ЕС, на якіх «у поўнай меры ляжа цяжар фінансавых выдаткаў, звязаных з нярыначнымі крокамі па абмежаванні канкурэнцыі».

**Георгій ГРЫЦ,**
**кандыдат эканамічных навук.**


**ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества унитарного предприятия «СИ-трейдинг-Строй»**

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2096 | Щит DOKA 0,9*2,7 (26 штук), Щит DOKA 0,9*2,7 ун (14 штук), Щит DOKA 0,6*2,7 (18 штук), Щит DOKA 1,35*2,7 (33 штуки), Щит DOKA 0,45*2,7 (2 штуки), Щит DOKA 0,3*2,7 (3 штуки), Угол разводной DOKA 0,3*2,7 (4 штуки), Щит DOKA 0,9*3,0 ун (2 штуки), Щит DOKA 0,9*3,0 (8 штук), Щит DOKA 0,9*3,3 (18 штук), Щит DOKA 0,9*3,3 ун (27 штук), Щит DOKA 1,35*3,3 (33 штуки), Щит DOKA без фанеры 1,35*3,3 (9 штук), Щит DOKA 0,6*3,3 (4 штуки), Щит DOKA 0,3*3,3 (5 штук), Угол внутр. DOKA 0,3*3,3 (7 штук) | 113638,80 | 11363,88 | 5681,94 |

В отношении лота проводятся первые торги

**Местонахождение:** Минский район, Боровлянский с/с, д. Копище, ул. Николая Михайлашева, 1Б

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **2 июля 2025 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **С 10.00 2 июня 2025 года до 16.00 1 июля 2025 года** |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», унитарное предприятие «СИ-трейдинг-Строй», проводимых 02.07.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.
**Вознаграждение аукциониста: 5 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 14 (четырнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375 (29) 650-45-60, Николай (пн – пт с 10.00 до 17.00).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **Строительное унитарное предприятие «СИ-трейдинг-Строй» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375173958917, info@p-k.by (220081, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, 7А/1-36, офис № 803, УНП 691526626)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

# ПАМІЖ СЦЫЛАЙ І ХАРЫБДАЙ

## Як выбары ў Польшчы ператварыліся ў бітву двух кашмараў і што чакае палякаў пасля падліку галасоў

**У найбліжэйшую нядзелю, 1 чэрвеня, Польшча зробіць выбар не паміж святлом і цемрай, а паміж дзвюма версіямі апакаліпсісу. Пройдзе другі тур выбараў прэзідэнта. На рынгу Рафал Тшаскоўскі, праеўрапейскі тэхнакрат з аблічам банкіра, і Караль Наўроцкі, кансерватыўны гісторык, чыя біяграфія пахне нафталінам часоў «Халоднай вайны». Абодва майстры скандалаў, абодва закладнікі партыйных машын, паведамляе «Першы інфармацыйны».**



Падчас тэледэбатаў Наўроцкага злавілі на ўжыванні забароненага «насавога тытуню». А ён адказаў, што гэта «каб не заснуць ад сумных прамоў апанента», і прапанаваў Тшаскоўскаму прайсці тэст на наркотыкі. Выбар звёўся да пытання: «Хто горшы — «еўрабюракрат» ці «маральны ханжа»? Палякі, якія стаміліся ад супрацьстаяння «Права і справядлівасці» і «Грамадзянскай платформы», масава галасуюць за ультраправых ці проста не ідуць на ўчасткі. 1 чэрвеня краіна атрымае не лідара, а «новы віток канфлікту» з вета, судамі і абвінавачваннямі ў «дзяржаўнай здрадзе».

Выбіраць палякам не даводзіцца, а калі ўжо і трэба, то доўга думаць карысці няма. Затое Тшаскоўскі і Наўроцкі шукаюць выбаршчыкаў вельмі заўзята. Першы кандыдат зрабіў стаўку на моладзь, спрабуе заваяваць сэрцы студэнтаў, сагрэўшы іх бясплатнай кавай. Імкнецца перацягнуць на сябе галасы партый левых і «трэцяга шляху». Але, судзячы на яго перадвыбарным прамовам і выступленням, хутчэй пачне раздаваць аўтографы, чым рэформы.

У Наўроцкага з папулярнасцю таксама ўсё не гладка. Яго апора — кансерватары, сагнуліся ад поўнага скандаламі і абяцаннямі мяшка і вось-вось пакінуць кандыдата. За Наўроцкага нават у кансерватыўных рэгіёнах гатовы прагаласаваць каля 40 % выбаршчыкаў. Замала, а таму ён спадзяецца на галасы правых — фанатаў Славаміра Ментцэна і Гжэгажа Браўна.

Дарэчы, апошні — ультраправы экс-кандыдат Гжэгаж Браўн — афіцыйна падтрымаў Караля Наўроцкага. Пра гэта паведамляе БелТА са спасылкай на польскае выданне Onet.

У відэа на YouTube Браўн падкрэсліў, што яго рашэнне зразумелае і не пакідае месца для спекуляцый. «Праз некалькі дзясяткаў гадзін я буду галасаваць за Наўроцкага», — сказаў ён.

Нагадаем, што ў першым туры прэзідэнцкіх выбараў Гжэгаж Браўн заняў чацвёртае месца, набраўшы 6,34 %, ці больш за 1,2 мільёна галасоў падтрымкі. Славамір Ментцэн заняў трэцяе месца з 14,8 % галасоў.

Што датычыцца яго выбаршчыкаў, то раней Ментцэн абвясціў конкурс на іх галасы і паабяцаў, што дастануцца яны таму, хто падпіша дэкларацыю з шэрагам палітычных абавязацельстваў. Сярод пунктаў, напрыклад, патрабаванне не прымаць законы аб уступленні Украіны ў НАТА, не павышаць падаткі, не абмяжоўваць абарот наяўных грошай, не накіроўваць польскіх вайскоўцаў ва Украіну і не перадаваць паўнамоцтвы ЕС. Наўроцкі падпісаў дакумент. Тшаскоўскі адмовіўся, катэгарычна адкінуўшы пункт аб блакіраванні сяброўства Украіны з НАТА.

Для перамогі кандыдату неабходна набраць мільёны галасоў, і ў гэтай вайне ўсе спосабы добрыя. У тым ліку ўзаемнае псаванне белых нагруднікаў.

У разгар электаральнай кампаніі высветлілася, што сапартыйцы Тшаскоўскага, члены ўрада Польшчы, замешаны ў кантрабандзе людзей. Аднак усё хутка замялі. Згодна з крыніцамі, «Грамадзянская платформа» мае дачыненне да стварэння арганізаваных каналаў перапраўкі мігрантаў.

У бок «ПіС» таксама валам сыплюцца кампраматы. Апублікавана расследаванне, у якім Наўроцкі абвінавачваецца ў пастаўцы дам лёгкіх паводзінаў у гасцініцу. І ў гэтым ён не проста ўдзельнічаў, ён гэта арганізоўваў. Але і без таго скандалу рэйтынг Наўроцкага хістаецца. Няўстойлівым зрабіў яго сам палітык. Ён умудрыўся ў прамым эфіры «закінуць» пад губу. А для лепшага засваення запіць вадой.

Як скончыцца другі віток прэзідэнцкай кампаніі ў Польшчы, даведаемся ўжо хутка.

### Кампетэнтна

## АМАЛЬ ТРАЦІНА ПАЛЯКАЎ НЕ ЗБІРАЕЦЦА ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ВЫБАРАХ

**Кандыдатаў на пасаду прэзідэнта Польшчы турбуе толькі знешняя палітыка і дэманізацыя Беларусі і Расіі, а не сапраўдныя патрэбы выбаршчыкаў. Такім меркаваннем у эфіры «Першага інфармацыйнага» падзяліўся дэпутат Палаты прадстаўнікоў Аляксандр ШПАКОЎСКІ.**

Эксперт адзначыў, што такая абыякавасць не засталася незаўважанай і цяпер выяўляецца ў няўдзеле палякаў у электаральнай кампаніі:

— Значная частка палякаў, у цэлым больш за 30 %, не ўдзельнічае ў гэтай электаральнай кампаніі і, так бы мовіць, галасуе нагамі, тым самым дэманструючы, што палітыкі не выказваюць інтарэсаў простых грамадзян. Сапраўды, кампанія ідзе такім чынам, што ўнутраны парадак дня адыходзіць на другі план парадаксальным чынам. Хоць у Польшчы нямала ўнутраных праблем, пачынаючы ад адаптацыі мігрантаў з Украіны і заканчваючы пэўнымі эканамічнымі цяжкасцямі. Аднак выбіраюцца пытанні менавіта сусветнага характару, напрыклад, цяперашняй эскалацыі міжнароднай сітуацыі, нагнятаюцца беспадстаўныя страхі вакол Расійскай Федэрацыі і Беларусі. Вобраз нашых дзяржаў свядома дэманізуецца польскімі палітычнымі вярхамі.


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор аукциона:** ООО «САНЗУРА», Минская область, Молодечненский р-н, г. п. Чисть, ул. Заводская, д. 3/1, комната 1-24

**Оператор:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by

**Продавец:** ОАО «Опытный завод металлоконструкций», 220073, г. Минск, пр-т Пушкина, 68

**Предмет электронных торгов: имущество (бывшее в употреблении), расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Пушкина, 68**

**Перечень 1 (снижение начальной стоимости на 80 %)**

| Лот, № | Наименование | Инв. номер | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1 | Выпрямитель для дуговой сварки ВДУ 1250 УЗ | 386.2 | 3 312,00 |
| 2 | Выпрямитель для дуговой сварки ВДУ-506С УЗ | 384.2 | 312,00 |
| 3 | Ножницы листовые НБ633 | 33.3 | 864,00 |
| 4 | Полуавтомат для дуговой сварки ПДГО-510сВДУ-506 | 419.1 | 816,00 |
| 5 | Полуавтомат для дуговой сварки ПДГО-510сВДУ-506 | 418.1 | 816,00 |
| 6 | Полуавтомат сварочный Powertekc 355C | 488.1 | 1 728,00 |
| 7 | Полуавтомат сварочный ПДГ-508М-1 | 405.4 | 120,00 |
| 8 | Полуавтомат сварочный с аксессуарами NB-500 | 405.5 | 744,00 |
| 9 | Пресс правгиб 2Н40 | 63.3 | 4 584,00 |
| 10 | Сварочный выпрямитель ВД-301 | 118.4 | 84,00 |
| 11 | Сварочный выпрямитель ВДУ-504 | 137.4 | 240,00 |
| 12 | Сварочный полуавтомат WEGA 500 MIG | 390.4 | 648,00 |
| 13 | Сварочный аппарат Origo Mig 510w | 459.1 | 2 112,00 |
| 14 | Сварочный аппарат Origo Mig 510w | 460.1 | 2 112,00 |
| 15 | Сварочный выпрямитель KITin 190 | 382.2 | 211,20 |
| 16 | Сварочный п/автомат ESAB Mig 505 | 387.5 | 816,00 |
| 17 | Сварочный п/автомат ESAB Mig 505 | 385.4 | 816,00 |
| 18 | Сварочный п/автомат ESAB Mig 505 | 386.5 | 816,00 |
| 19 | Сварочный п/автомат ESAB Mig 505 | 499.4 | 816,00 |
| 20 | Сварочный п/автомат FASTMIG KM 500 | 380.4 | 1 152,00 |
| 21 | Сварочный п/автомат Jackle Mig-326G | 338.1 | 984,00 |
| 22 | Сварочный п/автомат KEMPI (в комплекте) | 375.4 | 1 560,00 |
| 23 | Сварочный п/автомат KIT 500S--И.Ф. | 361.4 | 888,00 |
| 24 | Сварочный п/автомат Origo Mig 510 | 381.4 | 1 728,00 |
| 25 | Сварочный п/автомат Origo Mig 510 | 358.4 | 1 728,00 |
| 26 | Сварочный п/автомат Origo Mig 510 | 350.4 | 1 728,00 |
| 27 | Сварочный п/автомат Origo Mig 510 | 351.4 | 1 728,00 |
| 28 | Сварочный п/автомат ПДГ-503.4 | 388.4 | 456,00 |
| 29 | Сварочный п/автомат ПДГ-504 | 400.4 | 456,00 |
| 30 | Сварочный п/автомат ПДГ-504 | 777.2 | 552,00 |
| 31 | Сварочный п/автомат ПДГ-504 | 777.1 | 552,00 |
| 32 | Сварочный полуавтомат Mig 5004i 380-440V | 448.1 | 1 272,00 |
| 33 | Сварочный полуавтомат ПДГ-504 | 567.1 | 552,00 |
| 34 | Станок вертикально-сверлильный СТ2А13Б | 300.12 | 6 696,00 |
| 35 | Станок заточной ЗД692 | 163.2 | 1 344,00 |
| 36 | Станок кромкострогальный ГГП12 | 144.2 | 20 592,00 |
| 37 | Устройство термопереплета UNIBIND XU 138 | 432.1 | 26,40 |
| 38 | Торцефрезерный станок ТСФ4 | 75.2 | 15264,00 |

**Перечень 2 (снижение начальной стоимости на 80 %)**

| Лот, № | Наименование | Инв. номер | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1 | Пневмоножницы 6210 В | 245.6 | 45,60 |
| 2 | Кантователь Flipper | 452.1 | 6 840,00 |
| 3 | Машина газорезательная «Черномор 2» | 7.5. | 4 728,00 |
| 4 | Машина испытательная универсальная | 495.1 | 3 312,00 |
| 5 | Машина Р-100 разрывная | 496.1 | 3 312,00 |
| 6 | Машина стирально-отжимная ЛО-10 | 229.6 | 744,00 |
| 7 | Машина сушильная ЛС-8 | 231.6 | 230,40 |
| 8 | Окрасочный агрегат «Тритон» | 519.1 | 744,00 |
| 9 | Окрасочный агрегат «Тритон» | 481.1 | 504,00 |
| 10 | Сварочный трактор Miggytrac 1000 | 386.4 | 552,00 |
| 11 | Одношпиндельная сверлильная установка Ocean | 373.2 | 52 800,00 |

**Перечень 4 (снижение начальной стоимости на 20 %)**

| Лот, № | Наименование | Инв. номер | Начальная цена с НДС 20% |
|---|---|---|---|
| 1 | Кран козловой УК-25/50 | 50.2 | 39312,00 |
| 2 | Кран козловой К-184 | 50.1 | 39312,00 |
| 3 | Сосуд № 1 ТРЖК-2у | - | 6307,20 |
| 4 | Сосуд № 2 ТРЖК-2у | - | 6307,20 |
| 5 | Сосуд № 3 ЦТК-1.6/0.25 | - | 3715,20 |
| 6 | Сосуд № 41 ТРЖК-7М | - | 2851,20 |
| 7 | Насос кислородный 22НСГ 63/20А (250/200) | 221.5 | 7862,40 |
| 8 | Насос кислородный 22НСГ 63/20А (250/200) | 222.5 | 7862,40 |
| 9 | Стол-плита 6М616Ф11-100-012/11---И.Ф. | 512 | 6048,00 |
| 10 | Стол-плита 7216-120-011/11--И.Ф. | 513 | 8899,20 |
| 11 | Стол станочный для сборки металлоконструкций | 118.5 | 8899,20 |
| 12 | Стол станочный для сборки металлоконструкций | 126.5 | 6048,00 |
| 13 | Стол станочный для сборки металлоконструкций | 127.5 | 6048,00 |
| 14 | Стол станочный для сборки металлоконструкций | 119.5 | 6048,00 |
| 15 | Стол станочный для сборки металлоконструкций (1) | - | 6048,00 |
| 16 | Стол станочный для сборки металлоконструкций (2) | - | 6048,00 |

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 10.05.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **13.06.2025 г. с 10.00 до 11.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **12.06.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Перечень 5**

| Лот, № | Наименование | Инв. номер | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1 | Плоттер HP DesignLet T530 24-in Printer 5ZY60A, США | 524.1 | 1 188,00 |
| 2 | Твердомер ТШ-2 РФ | 499.1 | 4 320,00 |
| 3 | Копер маятниковый МК-30 РФ | 494.1 | 3 000,00 |
| 4 | Ножницы листовые Н-483 | 83.3 | 31 200,00 |
| 5 | Ножницы листов. Н-481А | 90.3 | 30 720,00 |
| 6 | Кромкоскалывающий агрегат CHP 12G Испания | 369.2 | 9 720,00 |
| 7 | Кран-укосина с тельфером г/п 1,0 т | 68.1 | 8 160,00 |
| 8 | Магнитный укладчик | 127.7 | 5 520,00 |
| 9 | Портативная газорезательная машина IMP РФ | 447.1 | 1 560,00 |
| 10 | Рольганг приводной (комплект) | 1021.5 | 2 040,00 |
| 11 | Стол для сборки металлоконструкций 960*4000 (1) | - | 6 960,00 |
| 12 | Стол для сборки металлоконструкций 960*4000 (1) | - | 6 960,00 |
| 13 | Стол для сборки металлоконструкций 960*4000 (1) | - | 6 960,00 |
| 14 | Стол для сборки металлоконструкций 960*4000 (1) | - | 6 960,00 |
| 15 | Стол для сборки металлоконструкций 1100*4000 (1) | - | 8 040,00 |
| 16 | Стол для сборки металлоконструкций 1400*6000 (1) | - | 15 240,00 |
| 17 | Стол для сборки металлоконструкций 1400*6000 (2) | - | 15 240,00 |
| 18 | Грузовой седельный тягач РЕНО ПРЕМИУМ, № кузова VF622GVA000131920, 2003 г.в. | 522.1 | 27 360,00 |
| 19 | Безвоздушная электрическая окрасочная установка SPT490 200V 50 HZ R (Китай) | 528.1 | 948,00 |
| 20 | Маш. газорез. «Черномр 2» | 7.5 | 28 080,00 |
| 21 | Машина для резки мет. листов Korsaras-7226 | 8.5 | 48 960,00 |
| 22 | Машина термич. резки металла «Комета» (УКРАИНА) | 370.2 | 13 680,00 |
| 23 | Порт. маш. с ЧПУ Vanad Are с комплектом обор. (Германия) | 372.2 | 62 760,00 |
| 24 | Портальная машина плазменной резки (Чешская Республика) | 466.1 | 74 160,00 |
| 25 | Универсальный вертикально-сверлильный станок 2С/132 | 165.2 | 3 960,00 |
| 26 | Сварочный трактор Miggytrac 1000 | 386.4 | 684,00 |
| 27 | Трактор сварочный ТС-16-1 в комплекте со сварочным выпрямителем ВДУ-1250 РФ | 389.1 | 15 600,00 |
| 28 | Трактор сварочный ТС-16-1 (типа АДФ-1002) РБ (УСС) | 420.1 | 3 120,00 |
| 29 | Магнитоукладчик к УБР-25 | 121.7 | 5 160,00 |

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **02.07.2025 г. с 10.00 до 11.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **01.07.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY13ALFA30122610040020270000 в BYN в ЗАО «Альфа-Банк», БИК: ALFABY2X, получатель платежа – ООО «ИСКУССТВО УПРАВЛЕНИЯ», УНП: 193384519

**Контактное лицо по осмотру предмета электронных торгов и наличию обременений:** Дмитрий Александрович, тел. +375293180535

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов: 5** (пять) рабочих дней после подписания договора

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **от 8–10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |
|---|---|

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень



**АВЕН.** На гэтым тыдні зможаце настроіцца на актыўнае і творчае жыццё. Добра будзе адпravіцца ў забаўляльныя паездкі, наведаць канцэрты, клубы, дыскатэкі. Магчымае рамантычнае знаёмства, пры якім адносіны будуць гарманічна і імкліва развівацца.



**ЦЯЛЕЦ.** У вас палепшыцца фінансавае становішча. У цэлым у гэтыя дні вы, магчыма, будзеце схільныя весці ціхі адасоблены лад жыцця. Добры час для канцэнтрацыі на духоўных практыках з мэтай самаўдасканалення.



**БЛІЗНЯТЫ.** На гэтым тыдні зможаце палепшыць узаемаадносіны з навакольнымі людзьмі. Выдатны час для стратэгічнага планавання, разлічанага на месяцы і гады наперад. Вы здольныя скласці рэалістычныя планы.



**РАК.** Першая палова тыдня спрыяльная для дасягнення пастаўленых мэт, што дазволіць вам прымаць узважаныя рашэнні і хутчэй дамагацца ажыццяўлення задум. У цэлым увесь тыдзень добра падыходзіць для вырашэння фінансавых пытанняў.



**ЛЕЎ.** Зможаце шмат чаго дабіцца ў пачатку тыдня дзякуючы ініцыятыўным паводзінам. Спрыяльны перыяд для Львоў, занятых сур'ёзнай вучобай. Калі дагэтуль было адставанне ў навучанні, то цяпер вы зможаце нагнаць упушчанае і запоўніць прабелы ў ведах.



**ДЗЕВА.** Зоркі чакаюць ад вас мэтанакіраваных дзеянняў і гатоўнасці пайсці на кардынальныя змены ў жыцці дзеля дасягнення пастаўленай мэты. Калі вы матываваныя на кар'ерны рост, зможаце ўмацаваць свае пазіцыі на займанай пасадзе.



**ШАЛІ.** Вас чакаюць займальныя зносіны і шмат яркіх уражанняў, магчыма, атрымаецца абзавесціся новымі сябрамі. Могуць актывізавацца сямейныя адносіны, дзе ўсё будзе грунтавацца на ўзаемнай павазе і каханні. Такі стыль дазволіць вам не толькі абмяркоўваць, але і вырашаць многія сур'ёзныя практычныя пытанні.



**СКАРПІЁН.** Гэты тыдзень атрымаецца досыць дынамічным. Зоркі раяць ставіць перад сабой амбіцыйныя задачы на мяжы магчымага. Каб дамагчыся пазітыўных змен у жыцці, трэба будзе праявіць гатоўнасць нешта змяніць у рэжыме дня.



**СТРАЛЕЦ.** Час для гарманізацыі партнёрскіх адносін. Асабліва гэта датычыцца шлюбнага саюза. У фінансавай сферы таксама ўсё можа складвацца паспяхова, асабліва ў першай палове тыдня. Магчыма, вы адчуеце патрэбу ў творчай рэалізацыі. Паспяхова ідзе вучоба, здача экзаменаў.



**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні зможаце шмат у чым упарадкаваць свой лад жыцця. Добры час, каб забяспечыць камфорт у доме. Не забывайце аб ранішняй гімнастыцы, загартоўцы і збалансаваным харчаванні. Усе гэтыя меры дапамогуць вам значна ўмацаваць арганізм.



**ВАДАЛІЎ.** Тыдзень спрыяльны для рамантычных і шлюбных адносін. Добра падыходзіць гэты час для творчых людзей — наведайце канцэрты, тэатры, выстаўкі. Таксама вы можаце адкрыць для сябе нейкі займальны творчы занятак. Цікава будуць праходзіць паездкі за горад.



**РЫБЫ.** Зоркі рэкамендуюць забыцца пра забавы і засяродзіцца на дзелавой актыўнасці. У гэтыя дні вы зможаце паспяхова справіцца з любымі гаспадарча-бытавымі справамі. Займіцеся добраўпарадкаваннем жыллёвых умоў. Можа палепшыцца ваша фінансавае становішча.

## ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «Падпішыся, чытай — зберагай ураджай!»

### I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Падпішыся, чытай — зберагай ураджай!» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі (тэрмін — з 2 чэрвеня 2025 года да 30 верасня 2025 года ўключна) з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» і газету «Літаратура і мастацтва» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2025 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

### II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся, чытай — зберагай ураджай!» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт., з ПДВ, руб. кап. | Усяго з ПДВ, руб. кап. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Сушылка для агародніны і садавіны «Мастерица EF-3070» (чорны/золата) (далей — суперпрыз) | 1 | 132,14 | 132,14 |
| 2 | Сушылка для агародніны і садавіны Vitek VT-5067 (далей — прыз) | 7 | 76,631 | 536,42 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся, чытай — зберагай ураджай!» складае 668,56 (шэсцьсот шэсцьдзясят восем) рублёў пяцьдзясят шэсць капеек.

### III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Падпішыся, чытай — зберагай ураджай!» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» і газету «Літаратура і мастацтва» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2025 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» або газету «Літаратура і мастацтва» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2025 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 2 чэрвеня да 11 ліпеня 2025 года выразаная з газеты або з дадатковага ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» або газеты «Літаратура і мастацтва», якая змяшчаецца ў газеце «Звязда» і газеце «Літаратура і мастацтва» не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 2 чэрвеня да 11 ліпеня 2025 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі Установе пасля 14 ліпеня 2025 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

### IV. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦАМ

9. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 31 ліпеня 2025 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

10. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

11. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 прызоў (па адным для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

12. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз (суперпрыз), лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або членаў Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

13. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 8 жніўня 2025 года ўключна ў газеце «Звязда» і газеце «Літаратура і мастацтва».

Установа ў тэрмін да 8 жніўня 2025 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміна яго атрымання.

### V. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

14. Умовай выдачы прызоў і суперпрыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента ці квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» або газету «Літаратура і мастацтва» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2025 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза або суперпрыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза або суперпрыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» або газету «Літаратура і мастацтва» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2025 года.

15. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз або суперпрыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» або газету «Літаратура і мастацтва» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2025 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза або суперпрыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

16. Прызы і суперпрыз выдаюцца пераможцам у тэрмін да 30 верасня 2025 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, з панядзелка па суботу (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам Гульні па тэлефонах: (017) 271 12 94, 311 17 40 для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза або суперпрыза, Установа не аплачвае.

17. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

18. Пасля 30 верасня 2025 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

### VI. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

19. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за падачу падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

20. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якой-небудзь дадатковай узнагароды. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

21. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Падпішыся, чытай — зберагай ураджай!» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда» і газеце «Літаратура і мастацтва».

22. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефонах: (017) 271 12 94, 311 17 40.






Фота Лізаветы ГОЛАД.

**31 МАЯ** Даты Падзеі Людзі




**1515** год — у Навагрудку завяршылася будаўніцтва Барысаглебскай царквы — помніка гатычнай архітэктуры (пабудавана на месцы старажытнага храма XII ст., узведзенага з вапнавых квадраў і плінфы; фрагмент сцяны гэтага храма стаў часткай падмурка царквы). Ахоўваецца дзяржавай.

**1892** год — нарадзіўся (г. Рэчыца) Міхаіл Кікоін, французскі мастак беларускага паходжання. Удзельнічаў у выставах Парыжскага салона. Першыя персанальныя выставы прайшлі ў 1920-м і 1924-м гадах. Творы былі прадстаўлены на выставе сучаснага французскага мастацтва ў Маскве ў 1928 годзе. У экспазіцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь знаходзіцца адзін твор Міхаіла Кікоіна, яшчэ некалькі маюцца ў асабістых калекцыях.

**1905** год — нарадзіўся Георгій Георгіевіч Вінберг, савецкі гідрабіёлаг і лімнолаг; заснавальнік экалагічнай фізіялогіі водных жывёл у Беларусі, член-карэспандэнт АН СССР.




**1223** год — бітва на рацэ Калка: мангола-татары пад камандаваннем хана Субэдэя разбілі аб'яднаныя руска-палавецкія дружыны.

**1892** год — нарадзіўся Канстанцін Паўстоўскі, рускі савецкі пісьменнік, сцэнарыст і педагог, журналіст, ваенны карэспандэнт, перакладчык. У савецкі час яго аповесці і апавяданні ўвайшлі ў праграму савецкіх школ па рускай літаратуры для сярэдніх класаў як адзін з сюжэтных і стылістычных узораў пейзажнай і лірычнай прозы. Чатыры разы быў намінаваны на Нобелеўскую прэмію па літаратуры

**1930** год — нарадзіўся Клінт Іствуд, папулярны амерыканскі акцёр і рэжысёр. У 1960—1980-х гадах быў у ліку найбуйнейшых зорак Галівуда, ствараючы, у асноўным, вобразы нешматслоўнага героя баевікоў і вестэрнаў. Цяпер 95-гадовы Клінт Іствуд з'яўляецца аўтарытэтным рэжысёрам і валодае двума «Оскарамі» за найлепшую рэжысуру ў 1992 і 2004 гадах.

**1935** год — была прынята пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб ліквідацыі дзіцячай беспрытульнасці і безнагляднасці».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10 951. Індэкс 63850. Зак. № 1060.

Нумар падпісаны ў 19.30 30 мая 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12